Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

פּרעלעטאריער פון אַלע לענדער, פאַרייניגט זיך!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

ЧАЦЬВЕР
12 лютага 1932 г.
№ 34 (3423)

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: Перадавы—За добрую дарогу.

Прамова т. ЛІТВІНАВА на Жэнеўскай канфэрэнцыі па «разбраеньню».

XVII УСЕСАЮЗНАЯ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯ. Даклад т. КУЙБЫШАВА аб другой пяцігодцы (2 і 3 стар.).

Барацьба за ўраджай—важнейшае зьвяно ў справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Ліст тав. ЯКАЎЛЕВА Усесаюзнай камсамольскай нарадзе па аўладаньні агратэхнікай (4 стар.).

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б аб месячніку ліквідацыі прарываў у дарожным будаўніцтве (1 стар.).

На канфэрэнцыі па „разбраеньню"

Прамова тав. ЛІТВІНАВА

ЖЭНЭВА, 11-II. На ўчорашнім ранішнім пасяджэньні канфэрэнцыі па «разбраеньню» выступіў з прамовай старшыня савецкай дэлегацыі тав. Літвінаў.

Скляканьне данай канфэрэнцыі,—заявіў тав. Літвінаў,—зьяўляецца вынікам, на нашай думцы, надзвычай працяглай падрыхтоўчай работы. Але гэта падрыхтоўчая стадыя вычарпана. Сучасная канфэрэнцыя стаіць тварам да твару перад задачай разбраеньня, якое павінна атрымаць практычнае выражэньне без далейшых адтэрмінак і правалочак, асновы сучаснай канфэрэнцыі былі закладзены за час сусьветнай вайны.

Упершыню ў вайну былі ўцягнуты мільёны і дзесяткі мільёнаў народу, а ў некаторых краінах амаль не пагалоўна ўсё мужчынскае насельніцтва і гэта пры рэзка выміраючых суладных сямейных сіл і сацыяльна-палітычным фактаў. Ужо ў час самой вайны чуцен гучным пратэсты супроць яе, чуцен лёзунг «вайна вайне». Сама вайна мела працягвацца і мільёны ахвяр укінуты ў яе з прычыны лёзунгу, якога якому гэта вайна павінна была быць апошняй вайной.

Не гледзячы на тое, што сусьветная вайна 1914-1918 гг. была названа «апошняй вайной», уся пасьляваенная гісторыя міжнародных адносін характарызуецца няспынным, сыстэматычным ростам узброеных сіл капіталістычных дзяржаў і гіганцкім павялічэньнем агульнага цяжару мілітарызму.

Годы ўсеагульнага зьбядневаньня, якія пайшлі пасьля вайны, годы залеч вашых ран, нанесеных усім сабудзе нікам вайны, як пераможным, так і непераможаным краінам, узмацнілі патрабаваньне аб спыненьні вайны. Гэтыя патрабаваньні, на думцы савецкай дэлегацыі, ня могуць быць здаволены стабілізацыяй або вызначанымі абмежаваньнямі ўзбраеньняў, а толькі вышэйшаваньнем сродкаў па зьнішчэньні інструмэнту вайны.

Савецкі ўрад удзельнічае ў гэтай канфэрэнцыі ня ў моц якіх-небудзь фармальных абавязацельстваў і ня ў моц чаго-небудзь, навязанага яму зьвонку. З вершых дзён свайго існаваньня ён ня толькі на словах, але і на справе ахуляў вайну ў якасьці зброі вырашэньня палітыкі, выказваўся супроць усякіх кантрыбуцый і тэрытарыяльных анэксій, супроць прыняволеньня адных народаў другімі і агалосіў лёзунг самавызначэньня народаў. З таго часу ён ва ўсёй уласнай палітыцы строга і пасьлядоўна праводзіць лінію мірнага лёяльнага супрацоўніцтва з іншымі народамі.

Вымушаны вайну, як зброю нацыянальнай палітыкі, ён, натуральна, ня бачыў і ня бачыць патрэбы ва ўтрыманьні армій і іншых узброеных сіл і, выконваючы ўпяршыню на міжнародную канфэрэнцыю ў Генуе 10 год назад, прапанаваў поўнае і ўсеагульнае разбраеньне, як адзіны сродак па зьнішчэньні вайны. Гэту прапанову ён паўтарыў, як толькі быў запрошаны да ўдзелу ў работах падрыхтоўчай камісіі па разбраеньні.

Робячы гэтую прапанову, мой урад улічваў ня толькі настрой уласных народаў, але і патрабаваньні і заклікі на родаў усяго сьвету. Высоўваючы гэтую прапанову, савецкая дэлегацыя на падрыхтоўчай камісіі настойвала на хутчэйшым яе ажыцьцяўленьні. Нам у камісіі пярэчылі. Нашы паказаньні на магчымасьць новай хуткай вайны высьмейваліся.

Прайшло ўсяго некалькі год з часу гэтых спрэчак і што-ж мы бачым? Канфэрэнцыя па разбраеньні павінна была адкрыцца пад грохат гармат і выбухў авіяцыйных бомб. Дзьве дзяржавы, зьвязаныя паміж сабой пактам Лігі нацый і парыскім дагаворам 1928 году, знаходзяцца ўжо 5 месяцаў у станоўішчы вайны, калі не дэюрэ, дык дэ-факта. Вайна яшчэ не зарэгістравана і не засьведчана ў натарыусе, але вялікая прапорцыя адной з гэтых дзяржаў акупаваны шмат лікім войскам іншай дзяржавы, а паміж рэгулярным войскам абедзьюх краін адбываюцца бойкі з удзелам усіх родаў зброі, тысячамі забітых і параненых.

Гэта адбываецца пакуль-што ў залежнасьці ад Жэнэвы, залежыць ад Эўропы, але яна атымістка, які можа дабракумлівна сьцьвярджаць, што пачатыя ваенныя дзеяньні абмяжуюцца толькі дзьвюма краінамі, або адным толькі матэрыком. Няма аптымізма, які асьмеліцца запэўніваць нас, што яшчэ на Далёкім Усходзе ня могуць стаць пачаткам новай вайны, якая ўжо свайй распаўсюджанасьці, сва ім ахопе і сваім жаху, з прычыны новых тэрытарыяльных удасканаленьняў будзе жакшай апошняй вайны.

Разьвядзеных палітычна і эканамічна матэрыкоў у наш час няма. Ёсьць краіны, разьмешчаныя на некалькіх матэрыках. У самой Эўропе наўрад ці знойдзецца шмат пар суседзяў, якія-б ня мелі паміж сабой сур'ёзных тэрытарыяльных рахункаў. Працягласьць межаў, законнасьць якіх аспар аецца вазраз больш значна, чымся ў часе ўзьнікненьня апошняй вайны. Якая ў нас гарантыя, што гэтыя рахункі ня будуць кінуты ў агульны сьнятлоны кацёл, калі хоць-бы адна з эўрапэйскіх дзяржаў будзе ўцягнута ў вайну.

Дапусьцім, што ўсяго гэтага ня здарыцца, што пажар на Далёкім Усходзе будзе лёкалізаваны або патушаны. Ці можа быць у нас упэўненасьць у тым, што такія-ж пажары ня ўзьнікнуць у другіх кутках зямнога кулі? Хто можа гэтаму перашкодзіць? Міжнародныя арганізацыі, пакты?

Але мы бачым, што яны ня здолелі ні папярэдзіць, ні прыпыніць ваенных дзеяньняў на Далёкім Усходзе з усімі выцякаючымі адсюль вынікамі. Хіба ня было за апошні час у эўрапэйскай і амэрыканскай прэсе артыкулаў, якія паказвалі на неабходнасьць і выгоды далейшага распаўсюджваньня далёка-ўсходняга пажару, якія паказвалі на вайну як на выхад з сучаснага крызісу, з таго самага крызісу, вострасьць якога немагчыма не растлумачыць апошняй вайной і яе вынікамі.

Ня можа перашкодзіць узьнікненьню войнаў і абмежаваньне ўзброеньняў. Таксама мала гарантуе нас ад вайны і скарачэньне ўзбраеньняў у асаблівасьці.

Для савецкай дэлегацыі, якая выходзіць з папрабаваньняў народных мас, дыктуемых умовамі сучаснага мо манту, праблема, якая стаіць перад канфэрэнцыяй, можа быць выканана кароткa ў словах: бясьпрэцэдэнтнасьць ад вайны. Гэтым наша канцэпцыя бязпраспасьці адрозьніваецца ад канцэпцый іншых дэлегацый. Газоравы аб бязпраспасьці, многія тут маюць на ўвазе забясьпечыць тэй або другой дзяржаве, на якую нападуць, максымальныя шансы выйгрышу вайны. Савецкая-ж дэлегацыя мяркуе, што мы павінны імкнуцца да таго, каб зрабець немагчымай самую вайну, бо ад яе цярпець народныя масы як выйграўшых, так і праіграўшых вайну краін, больш таго, народныя масы ўсяго сьвету, як мы ў гэтым пераканаліся па прыкладзе апошняй вайны.

З пункту гледжаньня скарачэньня ўзбраеньняў, французкія прапановы наўрад ці набліжаюць нас да мэты, паколькі яны зьяўляюцца папярэднімі ўмовамі, супроць якога-б то ні было скарачэньня ўзбраеньняў з боку Францыі.

Абгаварэньне гэтых умоў фактычна ператварыла-б гэтую канфэрэнцыю ў падрыхтоўчую да будучай канфэрэнцыі па разбраеньні, якая патрабавала-б, можа быць, ня менш часу, чым падрыхтоўчая камісія. Гутарка можа ісьці далей аб стварэньні новай міжнароднай арганізацыі з вельмі ад казнай сілаю, значыцца, аб стварэньні новага статуту і правіл для распаражэньня міжнароднай армією, для вызначэньня нападаў,—словам па разгорнуваньні мноства пытаньняў, безрэзультатна дабітаваўшыхся ў працягу дзесяцігодзьдзя ў нэтрах Лігі нацый, з дадаткам толькі новых і яшчэ больш складаных пытаньняў.

Досыць напомніць, што да гэтага часу адсутнічае, наколькі мне вядома, дакладнае і ўсімі членамі Лігі прызнанае, тлумачэньне 16 і іншых артыкулаў статуту Лігі і правіл іх ужываньня. Заняцца гэтымі толкамі пры сучасным абастрэньні міжнародных палітычных і эканамічных антаганізмаў, азначала-б адайсьці назад ад праблемы разбраеньня на многія, многія гады, калі не дзесяцігодзьдзі. Але мяне, аднак, больш усяго цікавіць французкія прапановы з пункту гледжаньня іх здольнасьці стварыць безапасносьць супроць вайны.

У чым сутнасьць прапаноў французкай дэлегацыі? Яны прапануюць новую армію, якая будзе складацца з некаторай колькасьці бомбавозаў, раскіданых па розных краінах, або сабраных у адным месцы, а таксама з некаторай колькасьці войска, рэзэрваванага ў розных краінах для асобага прызначэньня. Інакш кажучы, будзе створана некаторая армія, скажам, у некалькі сот тысяч чалавек, належна экіпіраваная, якая павінна будзе далучацца да сіл тэй дзяржавы, на якую будзе ўтвораны напад. Дзяржава, якая зьбераецца зрабіць напад на другую, павінна будзе загадзя лічыцца ня толькі з сіламі непасрэднага супрацьўніка, але і з сіламі, так скажаць, саюзнай з ёй армії.

Нападаючай краіне прыдзецца толькі ўлічваць загадзя сілы міжнароднай армії. Але гэта яшчэ ня ўсё. Якія гарантыі, што гэта міжнародная армія сапраўды будзе пушчана ў ход і прытым своячасова, раней чым слабейшы ўдзельнік канфлікту ня будзе канчаткова пераможаны? Якія гарантыі таго, што нападаючы бок будзе зараз-жа азначаны?

Гэтыя пытаньні ні ў якім разе на праздныя і ні ў якім разе не тэарытычныя, а падказваюцца тым рэальным міжнародным жыцьцём, якое нам усім знадома. Тут гаварылася аб нацыянальным эгаізьме, які паказвае інтэрнацыянальныя акцыі. Якія гарантыі што пры наяўнасьці гэткага эгаізму міжнародная армія ня будзе служыць інтарэсам тэй ці іншай дзяржавы, якая забясьпечыць сабе кіруючае становішча ў міжнароднай арганізацыі сэпаратнымі саюзамі, антантамі, згодамі?

У французкай прапанове аб забароне такіх саюзаў нічога не гаворыцца. Пытаньне аб міжнароднай армії ўзьнікла і абгаварвалася 13 год назад, калі не памыляюсь, пры выпрацоўцы статуту Лігі нацый, і вырашана адмоўна. А што датычыцца міжнародных супярэчнасьцяй і нацыянальнага эгаізму, дык усяго гэтага за 13 год нібыта ня зьменшылася. Досыць кінуць зрокам на ўсё тое, што адбываецца ў галіне эканамічных адносін.

Я пакідаю ў баку пытаньне аб тым, наколькі можна чакаць ад савецкай дзяржавы, каб яна дазрыла сваю безапасносьць і часткі свайго ўласнага войска міжнароднай арганізацыі, якая складаецца, у пераважнай большасьці, з дзяржаў, ядна варожых ёй і з-за варожасьці не падтрымліваючых з ёй ніякіх зносін. Можа хутчэй чакаць, што рабочыя і сяляне Савецкага Саюзу ўгледзяць у стварэньні міжнароднай армії ў гэтых умовах папрозу сваёй дзяржаве. Я павінен адкрыта і проста сказаць, не хаваючыся за ўмоўныя далікатнасьці, што такім чынам з пункту гледжаньня безапасносьці ад вайны, а значыцца безапасносьці дзяржаў, французкія прапановы выклікаюць у нас сялікія сумненьні і тым больш савецкая дэлегацыя паглыбляецца ў перакананьні, што адзіным верным і беспамылковым шляхам да вырашэньня праблемы арганізацыі міру праблемы папярэджаньня вайны, праблемы забясьпечэньня безапасносьці для ўсіх народаў зьяўляецца шлях, які раніць яна, шлях усеагульнага поўнага разбраеньня.

Было-б, аднак, неправільна адгэтуль заключаць, што савецкая дэлегацыя адмаўляе ўсякае значэньне і карысьць усякіх іншых сродкаў узмацненьня міру, апроч поўнага разбраеньня. Ня зьмяншаем мы таксама значэньня між народных мірных згод і абавязацельстваў. Мой урад у свой час далучаўся да парыскага дагавору 1928 г. і нават увёў яго ў дзеяньне з суседнімі дзяржавамі раней ініцыіраваў да гавору. Мой урад сам практыкуе заключэньне двохбаковых дагавораў аб ненападзе, маючых значна большае значэньне, чымся шматбаковыя альбо ўніверсальныя дагаворы. Ён прапанаваў і прапануе пакты аб ненападзе абсалютна ўсім дзяржавам.

Гэтыя пакты добрыя ўжо тым, што яны зьяўляюцца добрым сродкам зьяўленьня мірных або іншых настрояў іншых дзяржаў. Калі прапанова аб пакце, зробленая намі другой дзяржаве, безадкладна прымаецца да ажыцьцяўленьня, мы канстатуем некаторы спакой ва ўзаемаадносінах з гэтай дзяржавай. Калі гэта прапанова не ад разу прымаецца, а абгаварваецца гадамі і пасьля першай літары подпісу наступае доўгае раздумваньне і дадатак астатніх літар подпісу адкладаецца, дык вачуцьцё спакою, натуральна, зьмяншаецца.

Але яшчэ больш сур'ёзныя сумленьні ў іх мірных настроях выклікаюць тыя дзяржавы, якія прапановы аб заключэньні пакту, пад тэй або іншай прычынай, або бяз усякай прычыны, зусім адкідваюць. Неабходна таксама прызнаць, што заключаныя пакты ненападу ўзмацняюць віну нападаючага... але пакты ня могуць лічыцца абсалютнай гарантыяй супроць нападу, ня могуць лічыцца сродкам, выключаючым вайну.

Адзінай значнай гарантыяй супроць вайны і яе спусташальных вынікаў пры сучасных акалічнасьцях мой ўрад лічыць толькі хутчэйшае і ўсеагульнае разбраеньне. Савецкая дэлегацыя ўнесла ў падрыхтоўчую камісію звыш 4 год назад праект канвэнцыі аб поўным разбраеньні, прапанаваўшы ажыцьцявіць гэтае разбраеньне на працягу чатырох год. Ці можа хто-небудзь адмаўляць, што, калі-б гэтая прапанова была прынята, сучасныя далёка-ўсходнія падзеі ня маглі-б мець месца, ня было-б пагрозы новай сусьветнай вайны і перажываемы ўсім сьветам эканамічны крызіс, напэўна ня меў-бы сваёй сучаснай вострасьці?

Плян поўнага і ўсеагульнага разбраеньня выгодна адчуваецца ад іншых сваёй лёпкай магчымасьцю ажыцьцяўленьня і лёгкасьцю кантролю над яго ажыцьцяўленьнем. Мы ня маем ніякіх ілюзій адносна лёсу нашай прапановы. Савецкая дэлегацыя зробіла будзе абгаварваць любыя прапановы ў напрамку скарачэньня разбраеньняў.

Лічачы праект канвэнцыі, выпрацаваны падрыхтоўчай камісіяй, зусім недастатковым, савецкая дэлегацыя будзе абараняць тут свой уласны праект часткова скарачэньня ўзбраеньняў, які яна разглядае толькі як першы этап да поўнага разбраеньня.

Я дазволю сабе напомніць, што савецкая дэлегацыя на падрыхтоўчай камісіі ў сваім другім праекце канвэнцыі прапанавала поўнае зьнішчэньне найбольш магутных тыпаў узбраеньня, у тым ліку: 1. танкаў і зьвышдальняй артылерыі вялікай магутнасьці; 2. караблёў звыш 10 тысяч тон; 3. суднавай артылерыі больш 12 дзюймаў; 4. авіяносаў; 5. ваенных дырыжабляў; 6. цяжкіх бамбардыравальных суднаў і іншых зьнішчаючых сродкаў, якія скідаюцца з паветраных суднаў; 7. усіх сродкаў і прыстасаваньняў хімічнага, агнявога і бактэрыялёгічнага нападу.

Савецкая дэлегацыя прапанавала поўнаю забарону паветраных бамбардыровак, а ня толькі за межамі пэўнай зоны. Савецкая дэлегацыя прапанавала ня толькі адмаўленьне ад ужываньня сродкаў хімічнай вайны, але і ад падрыхтоўкі да яе ў мірныя часы.

Усе гэтыя прапановы захоўваюць свае поўную моц і для канфэрэнцыі. Савецкая дэлегацыя настойліва будзе рацьць прагрэсыўна - прапарцыянальны як найбольш аб'ектыўны і справядлівы мэтад скарачэньня ўзбраеньняў з ільготамі і выняцьцямі ў карысьць слабейшых краін, падвержаных нападу. Яна будзе горача падтрымліваць прапановы, якія найбольш набліжаюцца да яе ўласных. Яна будзе падтрымліваць роўнасьць усіх удзельнікаў канфэрэнцыі і адноль кавую бязапасносьць усіх дзяржаў, лічучы, што бязапасносьць даецца ў першую чаргу разбраеньнем.

У сэнсе бязпраспасьці прадстаўляемая мною дзяржава знаходзіцца ў больш пераважным становішчы, чым іншыя. Усяго 14 год назад, ужо са скончэньнем сусьветнай вайны, яна падвергла ся нападам ва ўсіх сваіх межах блёкадзе, палітычнаму і эканамічнаму байкоту. На працягу 14 год яна зьяўляецца прадметам нячуваных паклёпаў, выдумак і варожых кампаній.

Да гэтага часу вялізарная колькасьць дзяржаў, у тым ліку і адна з мацнейшых морскіх сіл, ня ўтойвае сваёй варожасьці да ёй, адмаўленьнем ад устанаўленьня мірных і нармальных зносін, а многія з дзяржаў, маючых з ёй нармальныя зносіны, адмаўляюцца ад заключэньня або зацьвярджаньня прапанаваных ёй пактаў аб ненападзе.

Сучасныя падзеі на Далёкім Усходзе, якія ўнушаюць усеагульную трывогу, выклікаюць натуральны асаблівы непакой у Савецкім Саюзе, які геаграфічна мяжуе з тэатрам гэтых падзей, дзе апэруюць вялізарныя арміі, дзе ўзбройваецца і групуецца контррэвалюцыйная, авантурная эміграцыя.

Ня гледзячы на ўсё гэта, я павінен тут заявіць аб гатоўнасьці прадстаўляемай мною краіны разбраіцца ў такой-жа меры і з гэткай-жа хуткасьцю, з якой згадзяцца на гэта іншыя дзяржавы і, у першую чаргу, непасрэдна з ёй мяжуючыя. Існуючыя паміж рознымі дзяржавамі палітычныя і эканамічныя супярэчнасьці, якія асабліва ўзмацніліся пасьля сусьветнай вайны і асабліва паглыбіліся цяпер, з прычыны сусьветнага крызісу, вядуць няўхільна і хутка да новага ўзброенага канфлікту паміж народамі. Гэты канфлікт, дзякуючы новым удасканаленым узбраеньня пагражае чалавецтву нячуванымі навалмі і бясприкладнымі спустошэньнямі.

Стварэньне бязпраспасьці супроць вайны немагчыма для ажыцьцяўленьня інакш, як праз хутчэйшае, поўнае і ўсеагульнае разбраеньне. Савецкая дэлегацыя ўнясе рэзалюцыю ў гэтым сэнсе, перакананая ў тым, што ніякіх аб'ектыўных перашкод да ажыцьцяўленьня ўсеагульнага разбраеньня ня будзе, калі да гэтага выкажуць гатоўнасьць прадстаўленыя тут урады. Са свайго боку савецкая дэлегацыя заяўляе, што, паставіўшы сабе задачай пабудову сацыялізму на тэрыторыі Савецкага Саюзу, савецкі ўрад у момант пасьпяховага завяршэньня першага пяцігадовага пляну, пасьля вялізарнейшых дасягненьняў ва ўсіх галінах гаспадарчага будаўніцтва, лічыць абсалютна даведзеным і відавочным для ўсіх — у чым ён, міжіншым, сам ніколі не сумняваўся — што для ажыцьцяўленьня пастаўленай ім сябе задачы, яму не патрабуецца павялічэньня тэрыторыі, не патрабуецца ўмяшаньне ў справы іншых дзяржаў, а таму ён ня меў бы патрэбы ні ў армії, ні ў флёце, ні ў ваеннай авіяцыі, і ні ў якіх іншых узброеных сілах.

Яму неабходна, аднак, упэўненасьць у тым, што і на тэрыторыю Савецкага саюзу ніхто ня будзе рабіць замаху, і што ў яго ўнутраныя справы іншыя дзяржавы ўмешвацца ня будуць, і што яго мірнае гаспадарчае будаўніцтва ня будзе парушана звонку.

Гэтую упэўненасьць ён атрымае толькі тады, калі і іншыя дзяржавы адмовяцца ад сваіх узброеных сіл. Такім чынам, маецца згода на поўнае разбраеньне дзяржавы, якая займае 6-ую частку зямнога кулі. Іншае залежыць ад адказу на гэту прапанову астатніх 5 шостых, прадстаўленых на гэтай канфэрэнцыі. У абставінах перажываемага цяпер усім сьветам нябачанага эканамічнага крызісу, які патрасае ўвесь будынак капіталістычнай сыстэмы, народныя масы, якія церпяць у нячуваній раней ступені ад беспрацоўя і паўсямеснага зьніжэньня зарплаты і стаяць перад пагрозай далейшых эканамічных паграсеньняў, цяжар якіх пануючыя клясы з ахвотаю перакладаюць, перш за ўсё, на іх, павінны быць пазбаўлены, наколькі гэта магчыма, ад пагрозы ваеннай катастрофы, якая ў ходзе эканамічнага крызісу становіцца ўсё больш і больш рэальнай.

Савецкая дэлегацыя ведае, што вышэйшай гарантыяй міру зьяўляецца толькі поўная перамога прынцыпаў, якая зьяўляецца прычынай, што нараджаюць узброеныя канфлікты. Але пакуль гэтыя прынцыпы ўрачыстваюць толькі на адным шостай зямнога кулі ёсьць толькі адзін сродак арганізацыі безапасносьці ад вайны — гэта поўнае і ўсеагульнае разбраеньне. Доказам яго магчымасьці да ажыцьцяўленьня зьяўляецца ўжо тое, што ён прапанусцца дзяржавай якая аб'ядноае звыш 160 мільёнаў чалавек. (ТАСС)

Пастанова ЦК КП(б)Б аб правядзеньні месячніка дапамогі дарожнаму будаўніцтву

Улічваючы, што работы па дарожным будаўніцтве пачаты з вялікім спазьненьнем, у выніку чаго ўжо маецца прарыў у галіне нарыхтовак і вывазцы асноўных будаўнічых матэрыялаў, што ўтварае пагрозу зрыву дарожна-будаўнічай праграмы 1932 году, ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Абавязаць з 15 лютага па 15 сакавіка месячнік ліквідацыі прарыву на дарожным будаўніцтве, прыцягнуўшы да актыўнага ўдзелу ў правядзеньні месячніка шырокія колы пралетарскай грамадзкасьці і працоўных вёскі.

2. У якасьці асноўнай задачы месячніка паставіць поўную вывазку патрэбнай колькасьці каменьня, пяску, гравія і лесаматэрыялаў для патраб дарожнага будаўніцтва і палепшаньня дарог мясцовага значэньня.

3. ГК і РК КП(б)Б узяць пад сваё кіраўніцтва правядзеньне месячніка, мабілізуючы прафэсыйныя, камсамольскія і грамадзкія арганізацыі ўтварыўшы на мясцох штабы па правядзеньні месячніка.

4. Абавязаць ГК і РК КП(б)Б, Галоўдортранс, ЦК Аўтадор, ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ, Калгасцэнтр і ЦП Саюзу чыгуначнага, шосавага і партовага будаўніцтва, распрацаваць пляны і парадак прыцягненьня грамадзкасьці да ўдзелу ў месячніку, неадкладна распачаўшы мабілізацыю мас вакол задачы месячніка.

5. Абавязаць Галоўдортранс БССР у двухдзённы тэрмін распрацаваць і апублікаваць сыстэму прэм'яваньня за лепшае правядзеньне месячніка, вылучыўшы для гэтай мэты адпаведныя фонды.

6. Сэкратару Друку ЦК КП(б)Б у двухдзённы тэрмін распрацаваць і разаслаць плян удзелу перыятычнага друку ў правядзеньні месячніка.

7. Для кіраўніцтва правядзеньнем месячніка і кантроля выкананьня гэтай пастановы арганізаваць штаб пры ЦК КП(б)Б у складзе т. т. Гаруновіча, Пэўзьнера, Фрумкіна, Плоткіна і прадстаўнікоў ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ і Калгасцэнтру.

За добрую дарогу

Дарожнае будаўніцтва мае выключна-важнае значэньне. Краіна, якая будуе сацыялізм, патрабуе новых тысяч каналеных шосавых і грунтавых дарог.

Бездарожжа—біч для нашай сацыялістычнай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. Бездарожжа ў шмат разоў павялічвае кошт сыравіны і прадуктаў першай неабходнасьці. Так, кошт перавозкі тоны солі па шашы каштуе 19 р. 84 к., а па прасёлачнай дарозе—на тую-ж адлегласьць, 71 р. (амаль у чатыры разы больш).

Наша сацыялістычная прамысловасьць, якая штодня ўсё больш і больш пашыраецца, патрабуе разгорнутай сеткі дарог для транспартоўкі аграмаднае колькасьці неабходных грузаў для заводаў, фабрык, пабудоў, калгасаў. З году ў год расьце грузапаток. Пры дрэнных дарогах страты ад бездарожжа з кожным годам павялічваюцца.

Паводле вестак Белдартрансу страты ад бездарожжа раўняліся ў 1928 годзе 10 мн. руб., у 1929 г.—14 млн. руб., у 1930 г.—29 млн. руб., у 1931 г.—49 млн. руб.

Дарожна-шосавае будаўніцтва адыгрывае ў эканоміцы БССР вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне.

Сёньня мы зьмяшчаем пастанову ЦК КП(б)Б аб правядзеньні месячніка дапамогі дарожнаму будаўніцтву.

Пастанова ЦК КП(б)Б падкрэсьлівае асаблівае значэньне месячніка «ва ўмовах пачатку дарожнага будаўнічага сэзону з вялікім спазьненьнем».

Прарыў у дарожным будаўніцтве атрымаўся з прычыны дрэннай загатоўкі і вывазкі асноўных будаўнічых матар'ялаў, што ўтварае пагрозу зрыву дарожна-будаўнічай праграмы 1932 г.

З 15 лютага па 15 сакавіка право дзіцца месячнік па ліквідацыі прарыву ў дарожным будаўніцтве. У якасьці асноўнай задачы месячніка паставлена поўная вывазка патрэбнай колькасьці каменьня, пяску, гравія і лесаматар'ялаў для патраб дарожнага будаўніцтва і палепшаньня дарог мясцовага значэньня. У правядзеньне месячніка павінны быць цягнуты шырокія колы пралетарскай грамадзкасьці гораду і прапоўных мас вёскі.

Раённыя камітэты КП(б)Б павінны ўзначаліць гэты месячнік і ўзяць пад сваё кіраўніцтва правядзеньне яго на мясцох.

Асаблівыя задачы высоўваюцца перад камсамолам. У мінулым годзе камсамолія БССР пачала барацьбу з бездарожжам і ў гэтай рабоце дасягнула даволі значных посьпехаў. Вопыт мінулага году паказаў, што камсамол здолеў мабілізаваць вакол барацьбы з бездарожжам шырокую пралетарскую грамадзкасьць і рабоча-калгасную моладзь. І ў гэтым будаўнічым сэзоне на долю камсамолу павінна выпасьці вялікая работа па ліквідацыі прарыву ў дарожна-будаўнічай праграме 1932 г.

Уже цяпер у бліжэйшыя дні ў справе дарожнага будаўніцтва павінен наступіць рэзкі пералом. Улічваючы вурокі мінулага году, калі цэнтр цяжару ўсяго будаўнічага сэзону няправільна пераносіўся на лета,—неабходна дабіцца бесьперабойнага ходу будаўніцтва. На вучастках і дыстанцыях павінны быць выпрацаваны пляны вярбоўкі кваліфікаванай рабочай сілы. У самым Галоўдортрансе ўжо цяпер павінны быць гатовы пляны, тытульныя сьпісы, кашторысы і праскты. Сэзон 1932 г. з павялічанай у многа раз праграмай дарожнага будаўніцтва неабходна спаткаць ва ўсеўзброеным тэхнічнай падрыхтоўкі.

Месячнік дарожнага будаўніцтва асабліва энэргічна павінен быць праведзены на сяле. Арганізаваны ўдзел калгасаў у дарожным будаўніцтве, упарадкаваньне справы выдачы нарадаў і кантроль за іх выкананьнем практыка сустрэчных плянаў у мясцовым дарожным будаўніцтве—усё гэта асноўныя зьвены калгаснага ўдзелу ў гэтай важнейшай рабоце. Цьвёрдыя заданьні па лініі працпавінасьці павінны быць выкананы. Неабходна дабіцца такога становішча, каб заможна-кулацкія гаспадаркі выканалі сваю працоўную павінасьць сваім асабістым працудзелам і ўжываньнем конскай цягавай сілы. Практыка замены працудзелу працовымі ўнескамі павінна быць зведзена да мінімуму.

Вядучы барацьбу са скажэньнямі клясавай лініі ў дачы цьвёрдых заданьняў бядняцка-серадняцкім гаспадаркам, РВК і сельсаветы пад кіраўніцтвам партарганізацыі на аснове сацыялістычнага буксіру калгасаў, павінны падцягнуць аднаасобны сэктар, які значна адстае ў працудзеле на дарожным будаўніцтве.

Самым слабым вучасткам заўсёды зьяўлялася арганізацыя самых будаўнічых работ. Рашуча ліквідуючы намылкі мінулага году, неабходна дабіцца ў гэтым годзе чоткай арганізацыі дарожна-шашовага будаўніцтва. Масы павінны быць прыцягнуты да абгаварэньня плянаў. Райдарінспэктары і інстанцыі павінны працаваць у цесным кантакце з сельсаветамі і калгасамі, бо будаўніцтва будзе эфэктыўным толькі тады, калі працоўнае насельніцтва будзе зацікаўлена ў ім і зразумее ўсю вялізарную гаспадарча-палітычную вагу насьць і культурнае значэньне добрай дарогі. Ужо цяпер неабходна падрыхтаваць дэталёва праўманы ўдзел арганізацыі работ, размеркаваньне сіл, сродкаў і цягі да будаўнічага сэзону. У гэтым будаўнічым сэзоне асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на правільнае і поўнае скарыстаньне мэханізмаў на ўсіх вучастках будаўніцтва і па ўсіх відах яго.

Дарожнае будаўніцтва набывае яшчэ большае значэньне за ўмовах нашых культурна-сацыяльных дасягненьняў. Далёкіны рост культурнага будаўніцтва ўпіраецца часткова ў бездарожжа. Трактары і аўтамабіль, рост матар'яльна-культурнага дабрабыту мас—усё гэта патрабуе добрых дарог. Весь чаму месячнік дарожнага будаўніцтва набывае асабліва вялікае сацыяльна-культурнае значэньне. На яго пасьпяховае правядзеньне трэба зьвярнуць максымум увагі. Самыя шырокія рабочыя, калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы, якія кіруючым чынам зацікаўлены ў справе дарожнага будаўніцтва—павінны быць прыцягнуты да практычнага ўдзелу ў дарожным будаўніцтве.

РВК і сельсаветы ў гэтым месячніку ліквідацыі прарываў у шосава-дарожным будаўніцтве павінны змагацца за пасьпяховае правядзеньне месячніка, стварыўшы ўсе ўмовы для забесьпячэньня будаўніцтва перавознымі сродкамі, рабочай сілай.

У барацьбу з бездарожжам і за поўнае выкананьне плянаў дарожнага будаўніцтва павінен уключыцца і раённы друк.

Дарогі—артэрыі краіны. Яны павінны быць здаровымі і гатовымі да тых вялікіх задач, якія партыя высоўвае перад ёй у 4-м заключным годзе першай пяцігодкі.

За пасьпяховае правядзеньне месячніка, за ліквідацыю прарываў у дарожным будаўніцтве 1932 г.! За добрую дарогу!

Аб выніках XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б

Рэзалюцыя сходу Менскага партактыву па дакладу т. ГІКАЛО

Заслухаўшы даклад тав. Гікало аб выніках XVII Усесаюзнай партканфэрэнцыі і XVI зьезду КП(б)Б, гарадзкі сход менскага партыйнага актыву поўнасьцю ўхваляе рашэньні XVII Усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV-га зьезду КП(б)Б.

Партактыў адзначае, што партыя пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК на чале з правадыром партыі тав. Сталіным, бязьлітасна змагаючыся на два фронты, супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі ва даным этапе, «левых» загібаў і прымірэнцтва да іх, прышла да XVII партканфэрэнцыі цэйна згуртаваной вакол ленінскага ЦК УсеКП(б), бальшавіцка-маналітнай, дабіўшыся вялізарных посьпехаў ва ўсіх галінах гаспадарчага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва, а таксама і ў галіне паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочай клясы, калгаснікаў і прапоўных мас.

На аснове перамог першай пяцігодкі стала магчымым у другой пяцігодцы паставіць задачу ліквідацыі капіталістычных элемэнтаў і кляс наогул, задачу пабудовы ў другой пяцігодцы бясклясавай сацыялістычнай грамады.

КП(б)Б, пасьлядоўна праводзячы генэральную лінію партыі, рашуча змагаючыся з правым і «левым» апартунізмам, на аснове правільнага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі і барацьбы на два фронты ў нацыянальным пытаньні, з ухілам у бок вялікарускага шавінізму—галоўнай небясьпекі, з ухілам у бок мясцовага шавінізму і шавінізмаў іншых колераў, супроць контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму, дабілася буйнейшых посьпехаў на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва.

Партактыў вітае прынятыя партканфэрэнцыяй дырэктывы па складаньні 2-га пяцігадовага пляну народнай гаспадаркі.

Дырэктывы аб 2-ой пяцігодцы складаюць асову для далейшага шпаркага росту БССР і «абумоўліваюць зжываньне эканамічнай і культурнай адсталасьці нацыянальнасьцяй, атрымнай у спадчыну ад царскага каленіяльна-капіталістычнага рэжыму».

Партактыў з усёй сілай падкрэсьлівае, што вялізарныя задачы, паставленыя дырэктывамі у 2-ой пяцігодцы могуць быць вырашаны толькі на аснове ўзмацненьня жорсткай клясавай барацьбы з элемэнтамі капіталістычных элемэнтаў, з іх перажыткамі, з чужымі нам элементамі.

Партактыў лічыць, што да бясклясавай грамады рабочая кляса прыдзе толькі праз жорсткую клясавую барацьбу, на аснове далейшага ўзмацненьня пралет

Даклад тав. КУИБЫШАВА аб другой пяцігодцы *)

Рэканструкцыя галін нар гаспадаркі

Неабходна спыніцца на перспектывах развіцця паасобных галін народнае гаспадаркі ў другім пяцігодзьдзі. Пачну з цяжкай прамысловасьці, якая, вразумелая рэч, працягае вастаўцца вядучай галінай усяе народнае гаспадаркі.

У ГАЛІНЕ МАШЫНАБУДАЎНІЦТВА. Важнейшай задачай у другім пяцігодзьдзі зьяўляецца развіцьцё іменна гэтай галіны прамысловасьці. Машынабудаўніцтву належыць вядучая роля ў справе тэхнічнага пераазбраеньня і рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі.

У галіне машынабудаўніцтва мы павінны вырашыць задачы не толькі колькаснага павялічэньня вытворчасьці, але і пастаноўкі новых вытворчасьцяў, новых найбольш дасканалых машын. Асабліва перад машынабудаўніцтвам павінна быць падкрэслена задача забясьпечаньня рэканструкцыі чорнай мэталюргіі, вугольнай і нафтавай прамысловасьці, стварэньне базы для электрыфікацыі, задача забясьпечаньня машынамі сельскае гаспадаркі, транспарту, лёгкай прамысловасьці. Новыя заводы для станкабудаўніцтва, электраабсталяваньня, паравозо- і вагонабудаўніцтва, горнага абсталяваньня, с.-г. машынабудаўніцтва, суднабудаўнічыя верфі, авіяцыйныя заводы побач з пабудовай вусканспэцыялізаваных загатовачных заводаў (ліцейныя, штамповачныя, кавальскія і г. д.), якія дазваляюць цалкам скарыстаць усё ўстаноўленае мэханічнае абсталяваньне, павінны забясьпечыць у краіне пабудову сваімі сіламі абсталяваньня, неабходнага для рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі.

Я хачу асобна падкрэсьліць якасныя заданьні, якія стаяць перад машынабудаўніцтвам, якія павінны быць вырашаны намі ў другім пяцігодзьдзі по бач з выкананьнем колькасных заданьняў. Я маю на ўвазе ўжываньне новых відаў апрацоўкі—ліцьцё пад ціскам, халодная штампоўка, зварка і г. д. Гэтыя мэтады пачынаюць укараняцца ў жыцьцё ўжо зараз. Але другое пяцігодзьдзе павінна быць характэрна іменна тым, што гэтыя новыя, больш дасканалыя мэтады вытворчасьці, гэта новыя тэхналёчныя працэсы павінны атрымаць усеагульнае распаўсюджваньне, павінны ўвайсьці ў плоць і кроў усяго начала машынабудаўніцтва: спэцыялізаваныя варштаты і машыны па апэрацыях, укараненьне аўтаматаў, дасягненьне дакладнасьці апрацоўкі на аснове разьвіцьця калібровачнай справы, палепшаньне канструкцый, павялічэньне магутнасьцей, большая дакладнасьць і лёгкасьць машын на аснове ўжываньня палепшаных матар'ялаў, замена мэталяў пласт-масамі і мэталізаваным дрэвам.

Вельмі кароткa аб мэханізацыі працаёмкіх работ. Тут вялізарная задача перад машынабудаўніцтвам. У другім пяцігодзьдзі мы павінны дамагчыся вырашэньня пытаньня мэханізацыі працаёмкіх работ. У новую пяцігодку мы ўступаем з поўнай ліквідацыяй беспрацоўя. І зусім відавочна, што цяжкія работы, якія патрабуюць вялізарнага фізычнага напружаньня, ня здолеюць быць забясьпечанымі рабочай сілай, калі мы ня зробім гэту работу больш лёгкай, больш прывабнай. Мы павінны ўсё больш вызваляць рабочых ад цяжкай фізычнай работы, перажладаючы яе на жалезныя плечы машыны. Гэта патрабуе мэханізацыі работ і прыстасаваньня да іх сучасных эфэктыўных машын.

У першую чаргу машынабудаўніцтва павінна забясьпечыць далейшую мэханізацыю ў галіне здабычы вугалю і руды. Па торфе—укараненьне фрэзэрнага мэтаду, побач з гідраторфам, мэханізацыя падрыхтоўчых і транспартных работ, тарфяныя камбайны. Па лесазагатоўках—маторныя пілы, падвесныя, ледзяныя дарогі, трактарная вывазка. Па будаўніцтве—ўстаўкавыя транспарцёры, экскаватары, мэханізацыя будаўнічых працэсаў, асабліва бэтонных работ, масавы выраб стандартных частак з мэханізаваным зборкі на месцы будоўлі. Па пагрузачных работах—краны, буйкорныя пабудовы на мясцох перавалаў, партах і г. д. Нарэшце, шырокае ўжываньне прасцейшых мэханізмаў нескладанай вытворчасьці. Усё гэта стаіць як важнейшая задача перад машынабудаўнічай прамысловасьцю.

У галіне вырабу **электраэнэргіі**, мы лічым неабходным даць вялізарныя заданьні. Я ўжо называў лічбу—100 млрд. квт. гадзін вырабу электраэнэргіі пры 20 млрд. квт. гадз. устаноўленай магутнасьці ў 1937 годзе. Пры гэтым павінна быць скончана кальцаваньне Прыдняпроўя, Данбасу, Паўночнага Каўказу, Уралу, Маскоўскай, Іваначоўскай і Ленінградзкай абласьцей. Вялікую ролю ў праграме электрабудаўніцтва ў другім пяцігодзьдзі будуць адыгрываць гідрастанцыі і цёплаэлектрацэнтралі, якія разьвіваюцца, галоўным чынам, на месцах тым запале і асабліва ў новых прамысловых раёнах.

Асабліва вялікія задачы стаяць перад намі ў галіне рэканструкцыі чорнай мэталюргіі, якая павінна дамагчыся выплаўкі чыгуна ў 1937 годзе ня менш 22 млн. тон. Праграма чорнай мэталюргіі на другое пяцігодзьдзе ў вонуўных сваіх рысах ужо ясна, і ас ноўныя аб'екты, якія павінны будавацца для таго, каб атрымаць гэтыя 22 млн. тон чыгуна, дастаткова выразна вырысоўваюцца. Апроч скончаньня Кузьнецкага, Магнітагорскага, Запарожскага, Ліпецкага, Азоўскага, Крывароскага, Ніжнятагільскага, Бакальскага, Сінарскага, Новатульскага заводаў, а таксама рэканструкцыі заводаў імя Варашылава, Дзяржынскага і Томскага відавочна будуць пачаты наступныя заводы: Халілаўскі (Сярэдняя Волга). Камарава-Зігазінскі (Башкірыя), Чэрамхоўскі, (Усходняя Сібір), Дашкясанскі (Закаўказьве), Сучанскі (Далёкі Ўсход). Апроч таго, найбольш поўнымі аб'ектамі для ўключэньня ў другую пяцігодку зьяўляюцца: завод на Хоперскіх рудах, завод на ўласных рудах ля Кузьнецку (месцанарадженьня Таш-Ітга), завод на адыходах хімічнай вытворчасьці (пірытныя агарыі) у Маскоўскай вобласьці, завод, які пераапрацоўвае руды магнітнай аномалі (ПЧО) і, нарэшце, завод для выплаўкі чыгуна з нядаўна вынятых руд у Мурманскім раёне для забясьпечаньня металям Ленінградзкай машынабудаўнічай прамысловасьці.

Адзнак, задача рэканструкцыі ня вычэрпаецца новым будаўніцтвам. Трэба лепш скарыстаць існуючыя домны, існуючыя мартэны, існуючыя прокатныя цэхі. Перад мэталюргіяй стаіць вялізарная рэканструкцыйная задача на зьмене працэсаў. Новае магутнае абсталяваньне, якое будзе выраблена ў нас у краіне, дакладная падрыхтоўка сыравіны, аглямэрацыя, сартоўка руды і г. д., прыстасаваньне электрапрацэсаў і скарыстаньне пабочных прадуктаў—газаў, шлякаў—вось што будзе зьяўляцца асновай рэканструкцыі мэталюргіі.

У галіне каляровай мэталюргіі мы павінны забясьпечыць такое разьвіцьцё, якое павінна нас зусім вызваліць ад замежнай залежнасьці. Мы павінны дасягнуць такой выплаўкі каляровых мэталяў, якая адаволіла-б цалкам усе нашыя патрэбы. Каляровая мэталюргія будзе разьвівацца і ў ДВК і ў Каазкстане, і ў Усходняй і Заходняй Сібіры, і на Каўказе, і ў Сярэдняй Азіі, і на Урале, і ў Паўночным, і Мурманскім краі і г. д., прычым асабліва значэньне будзе натуральна, мець тут Казакстан.

Але ў галіне каляровай мэталюргіі справа ня вычэрпваецца тым, што мы будзем будаваць новыя заводы, пашыраць існуючыя. Мы не даможамся неабходнага эфэкту да канца пяцігодзьдзя, калі ня будзем ужываць новых тэхналёгічных працэсаў, новых мэтадаў вытворчасьці. Мы павінны выхоўзіць з укараненьня сэлектыўнай флятацыі руд, як базы поўнага скарыстаньня паліметалічных руд. Плаўка рулы ў пылявідным стане, электралітны мэтад атрыманьня цынку, разьвіцьцё вытворчасьці новых відаў каляровых мэталяў—нікелю, магнія, берылія, рэдкіх мэталяў, скарыстаньне новых відаў сыравіны для вырабу эдюмінія, у прыватнасьці нефеліна,—вось задачы, якія стаяць перад каляровай мэталюргіяй, якія неабходна вырашыць для таго, каб дасягнуць колькарных вынікаў, аб якіх я гаварыў.

АПАЛАВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ будзе разьвівацца як у аснoўных раёнах здабычы вугалю, нафты, (Данбас, Караганда, Урал, Грозны, Баку, Эмба, новы Паўночна-Каўказкі раён), так і ў новых раёнах—на Далёкім Усходзе, дзе здабыча вугалю прадстаяўляе такую вельмі вызначную вялічыню. У Усходняй Сібіры, Пячорскім краі (вугалі), на Сахаліне (нафта), Камчатцы (вугалі) і г. д.

Вялізарнае разьвіцьцё павінны атрымаць такія апалавыя басэйны як Урал і Масква. Вялізарнае разьвіцьцё павінны атрымаць у другім пяцігодзьдзі сланец, торф і іншыя віды мясцовага апалу.

Здабыча вугалю павінна скласьці ў канцы пяцігодзьдзя ня менш 250 млн тон у год. Для таго, каб дасягнуць гэтай лічбы, неабходна шпаркім тэмпам разьвіваць новыя раёны, аб якіх я гаварыў. Параўнальна з тым, што гэтыя раёны будуць вытвараць у 1932 годзе, у 1937 годзе іх вытворчасьць павялічыцца ў многа раз.

Разьбіўка па раёнах коўсіць пакуль яшчэ ўмоўны арыентыровачны характар. Яна будзе ўдакладняцца і вельмі можа быць тыя ці іншыя зьмены будуць унесены, але маштабы разьвіцьця вызначэўваюцца. Данбас—першая вугальная база—дасягне здабычы ў 120 млн. тон. Масквавугальны раён—каля 20-22 млн. тон. Уралвугаль—25 млн тон, Кузбас—50 млн. тон...

Эйхэ. Мала.

Куйбышаў. Усходсібвугаль—11 млн. тон. Караганда, якая ў 1931 годзе не дала мільёну тон, будзе даваць 14 млн. тон, робіцца буйным каменавугальным басэйнам. Разгорнае работу Кварчэсты, якія будуць давать паўта ра мільёна добра коксуючыхся вугляў.

Эйхэ. Вы не абыйдзецеся гэтай коль касьцю.

Куйбышаў. Гэта здабыча вугалю за бясьпечнае выплаўку 22 млн тон і па трэбу асноўных галін народнай гаспадаркі. Што датычыцца разьмеркаваньня дабычы па раёнах, дык тут мы павінны забясьпечыць рашучы зрух на Усход. Калі Данбас зараз займае ў апалавым балянсе нашай краіны проц. 70, дык у канцы другога пяцігодзьдзя ён будзе мець ня больш 50 проц. Такім чынам палова здабычы вугалю не радаецца на новыя па сутнасьці раёны.

Здабыча **нафты** павінна дайсьці прыкладна да 80—90 млн. тон. У галіне рэканструкцыі нафтавая прамысловасьць зрабіла больш, чымся любая наша галіна прамысловасьці. Тым ня менш рэканструкцыю тут нельга лічыць закончанай як у галіне здабычы, як у галіне буранньня так і асабліва ў галіне перапрацоўкі нафты. Новыя мэтады буранньня, удасканаленыя мэтады здабычы ў галіне нафтаперапрацоўкі, крэкінг-працэс, які ўжываецца яшчэ ў недастатковай ступені,—усё гэта важнейшыя праблемы рэканструкцыі нафтавай прамысловасьці.

Важнейшае значэньне мае таксама газіфікацыя зугляў, значэньне, якой я хацеў-бы з усёй рэзкасьцю падкрэсьліць перад партканфэрэнцыяй.

Як адна з важнейшых задач будучага пяцігодзьдзя павінна быць пастаўлена задача разьвіцьця нашай **хімічнай прамысловасьці** і карэннай рэканструкцыі яе. Выраб азоту, выраб серкавай кіслоты, асабліва з адыходаў каляровай мэталюргіі, выраб суперфасфатаў і іншых угнаеньняў, скарыстаньне салікамокіх салей і г. д. павінна прыняць разьмеры, якія забясьпечвалі-б ўсе патрэбы народнай гаспадаркі і ў першую чаргу патрэбы сельскай гаспадаркі.

Па зырабу угнаеньняў мы павінны заняць першае месца ня толькі ў Эўропе, але і ва ўсім сьвеце, абагнаўшы Амэрыку.

Але і тут у хімій задачы колькаснага павялічэньня вытворчасьці зьвязаны ня толькі з будаўніцтвам новых заводаў, але і з рашучай зьменай самога працэсу вытворчасьці.

Напрыклад, перагонка бурых зугляў з мэтай атрыманьня нафты павінна мець у другім пяцігодзьдзі вялізарны размах.

Навуковая думка і работа тэхнікаў і практыкаў павінна быць накіравана на тое, каб у другім пяцігодзьдзі здабіцца масавага вырабу гэтага вадкага апалу з сапрапэліту (Усх. і Зах. Сібір) і сланцоў (Сяр. Волга, Ленінгр. вобл.). Вялікая задача ў галіне хімій стаіць у сувязі з апатытавым месцарожданем на Кольскай паўвысьпе, і асабліва ў сувязі з нэфэлінам, які можа быць вельмі шырока скарыстаны (атрыманьне алюмінія, матар'ялаў для вырабу шкла, цэменту, прапітка тканей і г. д.).

Апатыты павінны быць намі ў другім пяцігодзьдзі ўсебакова і максымальна скарыстаны (ня толькі для атрыманьня угнаеньняў, але і для атрыманьня ўсіх прадуктаў нэфэліну).

Наступная задача перад хіміяй—гэта штучнае валакно.

Цэнтральная задача хімічнай прамысловасьці—забясьпечыць выраб угнаеньняў. Задачы, якія мы ставім перад сельскай гаспадаркай, патрабуюць забясьпечаньня яе дастатковай колькасьцю угнаеньняў, як у частцы зберажэньня, так і тэхнічных культур, бо асноўны ўпор у галіне сельскай гаспадаркі мы ў другім пяцігодзьдзі робім на павышэньне якасных паказьнікаў і ў першую чаргу—падвышэньне ўраджайнасьці.

Я ня буду пераліваць цэлага раду іншых складанейшых задач, якія стаяць перад хіміяй. Хімія ў другім пяцігодзьдзі павінна разгарнуцца выключна шпаркімі тэмпамі, пым самым ня толькі ажыўляючы свае адставаньне, якое мае месца зараз, але і становяцца самай перадавой галіной народнай гаспадаркі.

Пераходжу да пытаньня разьвіцьця **лёгкай індустрыі.** Лёгкая індустрыя ў другой пяцігодцы будзе займаць некалькі іншае становішча, чым гэта было ў першай пяцігодцы. Гэта зусім зразумела. Дзьве абставіны зьяўляюцца тут рашаючымі. Першае: пастаўшы на ногі цяжкую прамысловасьць і разгарнуўшы машынабудаўніцтва, мы стварылі ўмовы для таго, каб лёгкую індустрыю рухаць наперад значна больш шпаркімі тэмпамі, якія адпавядаюць задачам, што стаяць зараз перад намі.

Другое: стварэньне сыравіннай базы. Завяршаючы калектывізацыю і значна пераўзбройшы сельскую гаспадарку, першая пяцігодка ўмацавала сыравінную базу па ўсіх галінах сельскай гаспадаркі, як: бавоўна, лён, буракі і г. д. У другой пяцігодцы таму мы можам праектаваць значна больш шырокае разгортваньне лёгкай і харчовай прамысловасьці. Мы таму можам паставіць сабе задачу ў канцы пяцігодкі пагаяніць нормы душавога спажываньня як у галіне прамтавараў, так і ў галіне харчовых прадуктаў, прыкладна ў 2-3 разы.

Надзвычайна вялікая праблема новага сацыялістычнага разьмяшчэньня лёгкай прамысловасьці. Асноўным прынцыпам зьяўляецца наближэньне перапрацоўкі да раёнаў сыравіны. У другой пяцігодцы павінен быць дасягнуты зрух лёгкай індустрыі на Усход, бліжэй да сыравіны. Бавоўнапрасовыя фабрыкі, вялікія магутныя бавоўна-папяровыя камбінаты, зразумела, не павінны больш будавацца ні ў Маскоўскай вобласьці, ні ў Іванава-Вазьнясенскай вобласьці. Яны па ўвінны будавацца там, дзе расьце бавоўна—у Сярэдняй Азіі, (Казакстане, ці раёнах, блізкіх да сыравіны. Разам з тым павінна быць прадугледжана максымальна-мэтазгоднае скарыстаньне транспарту—вагоны не павінны ісьці паражняком. Я маю на ўвазе Зах. Сібір, дзе будзе разьвіта базэйна-папяровая вытворчасьць, бліжэй пабудаваны магутны бавоўна-папяровы камбінат.

Лёнавыя прадпрыемствы будуць будавацца ў ДУК, у раёнах сыравіны Усходняй Сібіры, Паўночным краі, у Беларусі і г. д.

Цукровыя заводы таксама прасоўваюцца на Усход—Казакстан, Сібір, Сярэдняя Азія, уключаючы Кірэгізію, Закаўказьве і г. д.

Мясныя камбінаты—Казакстан, Усходняя Сібір і інш. раёны жыўёлагадоўлі. Але мясныя камбінаты будуць будавацца і ў раёнах спажываньня, у Маскве, Ленінградзе, і інш. буйных пралетарскіх цэнтрах.

Вялікія мясакансэрвазаваньня і рыбакансэрвавыя заводы будуць будавацца ў ДУК, у Казакстане, у Паўночным краі, на Мурмане і г. д.

Пераходжу да **сельскай гаспадаркі,** задачам яе рэканструкцыі за другую пяцігодку. Яні матэнак тут вырысоўваецца?

Мэтыпына-трактарныя станцыі ахопяць усе калгасы і мэханізуюць па сутнасьці ўсё паляводзтва. Таварна-калгасныя фэрмы павінны будуць атрымаць ўсю таварную жывёлагадоўлю і арганізаваць у сябе высокапрадукцыйную жывёлагадоўлю. Саўгасы павінны пашырыць сваю вытворчасьць і ўзмацніць сваю ролю як узорай сацыялістычнай арганізацыі вытворчасьці і працы, як прыклад прыстасаваньня да сельскай гаспадаркі высокай машыннай тэхнікі, усіх дасягненьняў сучаснай агранаміі.

Такавы агульныя тэхнічна-вытворчыя рамкі, у якіх будзе разьвівацца сельская гаспадарка.

Якія заданьні трэба паставіць перад сельскай гаспадаркай у другім пяцігодзьдзі? Мне ўяўляецца гэтыя задачы ў наступным выглядзе.

Перш за ўсё—гэта зрабіць устойлівым земляробства ў раёнах зараз засушлівых. Гэта датычыцца асабліва Сярэдняй і Ніжняй Волгі, Уралу, Казакстану і Сібіры.

Гэта праблема была нядаўна прадметам разгляду на асобнай канфэрэнцыі, скліканай Народным Камісарыятам Земляробства. Распрацоўку гэтай праблемы неабходна энэргічна працягваць і далей з тым, каб на момант складаньня другога пяцігадовага пляну мы мелі канкрэтна распрацаваныя мерапрыемствы, якія павінны быць ужыты за пяцігодзьдзе, з тым каб прыблізіць поўнае вырашэньне гэтай складанай праблемы. Гэта першая задача, якая стаіць у гэтым пяцігодзьдзі, якая павінна быць з усёй сілай падкрэслена.

Другая задача ў галіне сельскай гаспадаркі—гэта стварэньне збожжавых раёнаў у месцох спажываючай паласы. Да гэтага ёсьць усе магчымасьці калі ўжыць тут неабходныя ўгнаеньні.

Трэцяя задача—гэта перасоўваньне зярнёвых культур на Усход. Я маю на ўвазе Усходнюю Сібір і ДУК. Гэтыя вобласьці пры вядомых умовах маюць усе магчымасьці для таго, каб разьвіць у сябе зярнёвую гаспадарку і тым самым абыйсьціся ўласным хлебам за мест таго, каб залежыць ад прывозу з далёкіх месц. Разам з тым, гэта палягчае і рашэньне транспартных праблем.

Нарэшце, важнейшай задачай, якая датычыцца як зярнёвых, так і тэхнічных культур, зьяўляецца ўзьяўляцце ўраджайнасьці. Гэта задача для другой пяцігодкі сельскай гаспадаркі зьяўляецца цэнтральнай і рашаючай. Мы павінны з усёй рэзкасьцю паставіць пытаньне аб тым, каб дабіцца абрамаваньня з той жа дасягненьні, таго-ж га такой-жа колькасьці зярнёвых і тэхнічных культур, якое замянілаб нам неабходнасьць распашкі новых і новых земляў. Зразумела, рост пасеўных плошчаў будзе адбывацца і пасеўныя плошчы павінны будуць узрасьці са 143 млн., якія мы маем у 1931 годзе, прыкладна да 160-170 млн. га. Аднак, для таго, каб атрымаць тую колькасьць прадуктаў і зярнёвых і тэхнічных культур, якія патрэбны нам для выкананьня нашай праграмы па падвышэньні ўзроўню дабрабыту насельніцтва, па павялічэньні снабжэньня яго харчовымі і прамысловымі таварамі, гэта парадыўна невялікае за 5 год павялічэньне плошчаў павінна суправаджацца рэзкім падвышэньнем ураджайнасьці. Безумоўна, што ўсе прадпасылкі для шпаркага росту ўраджайнасьці ў нас у наяўнасьці: поўная мэханізацыя апрацоўкі зямлі, больш удасканаленае ўзорванне, чымся гэта было дагэтуль, угнаеньне, распаўсюджаньне ороднай барацьбы са шкоднікамі, агранамічныя мерапрыемствы,—усё гэта важнейшыя прадпасылкі да таго, што мы ў другім пяцігодзьдзі павінны ўзьняць ураджайнасьць зерня мінімум на 40 проц. Асабліва за дача ўзьняцьця ўраджайнасьці важна ў галіне тэхнічных культур, дзе паказьнікі дагэтуль асабліва нядобрыя.

Нарэшце, вялікія задачы стаяць у галіне жывёлагадоўлі, прычым і тут усе нашы посьпехі вызначаны перш за ўсё в задачамі якаснага парадку, асноўны ўпор павінен быць зроблены на столькі на колькасны прырост стада, колькі на дасягненьні адпаведнай якасьці статка. Шляхам мэханізацыі, шляхам ужываньня адпаведных зоатэхнічных мерапрыемстваў, мы павінны дабіцца чаго-б та ні каштавала рэзкага палепшаньня нашага стада (рагатай жывёлы, авечага стада і асабліва сьвіней), росту вагі тушы, росту ўдою і г. д. і г. д.

У галіне чыгуначнага транспарту ас ноўныя лініі яго разьвіцьця і рэканструкцыі па сутнасьці ўжо намечаны чэрвеньскім пленумам ЦК. У другім пяцігодзьдзі павінна быць канчаткова ліквідавана адставаньне чыгуначнага транспарту ад разьвіцьця іншых галін гаспадаркі.

Вядучая роля машынабудаўніцтва і прамысловасьці наогул тут відавочна: ад таго, колькі машынабудаўніцтва зможа даць паравозаў, вагонаў, электравозаў, цёплавозаў, апаратаў аўтасцэпкі, аўтаблякіроўкі, аўтатормазаў, рэйк, крэставін, шпал і г. д.—ад усяго гэтага залежыць работа чыгуначнага транспарту і працягласьць чыгуначных шляхоў, яго пруазваротаў. Але мала даць вялікую колькасьць паравозаў і вагонаў. Трэба даць паравозы і вагоны зусім іншага тыпу, чым ся выраблюцца зараз. Магутныя паравозы, магутныя вагоны—вось задача, якая зараз стаіць перад машынабудаўніцтвам, абслугоўваючым транспарт. У моц гэтага, відавочна, трэба перш за ўсё дакладна прадумаць пры складаньні другой пяцігодкі вось гэту забясьпечанасьць рэканструяванага чыгуначнага транспарту з адпаведным абсталяваньнем.

Вялікае значэньне павінны будуць атрымаць цеплавозы для таго, каб абслугоўваць чыгуначны транспарт у бязводных мясцовасьцях, дзе адпаведныя пабудовы для снабжэньня валой паравозаў надзвычайна дарагія і цяжка праводзімыя. Патрэбны электравозы—на гэтым трэба зрабіць асаблівы націск, таму што электрыфікацыя ў другім пяцігодзьдзі павінна заняць асабліва вялікае месца. Электрыфікацыя чыгуначных ліній—гэта ўжо на мара, а настойлівая неабходнасьць, патрэба сёньняшняга дню. Бяз яе мы ўжо ня можам абыйсьціся на поўных вучастках чыгуначных шляхоў: выхаду з Данбасу, выхаду з Уралу, сувязь Магнітгорскі з Кузбасам і на тых вучастках, дзе асабліва напружаны грузазварот і дзе адпаведны профіль шляху, які недаступны для паравозу, але лёгка вядзецца электравозам. Праблема электрыфікацыі набывае рашаючае значэньне для разьвіцьця чыгуначнага транспарту. Такія загружаныя станцыі і раёны, як Масква, як Харкаў, як Растоў на Дану, яны ў значнай меры павінны быць электрыфікаваны ўжо ў другім пяцігодзьдзі. На Урале і ў Закаўказьві, дзе прыродныя ўмовы такія, што бяз электравозаў нельга спраўляцца з існуючым навят зараз грузазваротам (а гэты грузазварот будзе шпаркае расьці на працягу другой пяцігодкі), электрыфікацыя павінна быць ажыцьцяўлена ў бліжэйшыя-ж гады.

Мы мяркуем, што чыгуначная сетка вырасьце ў канцы пяцігодкі прыблізна на 30 тыс. клм. Гэта будаўніцтва новых дарог павінна ісьці як па лініі разгрузкі перапружаных напрамкаў, так і па лініі пішэрскіх чыгунак у паасобных раёнах: Далёкаўсходні край, Сібір, **Паўночны край,** Сярэдняя Азія і г. д. і г. д.

Вялікае разьвіцьцё павінен атрымаць **водны транспарт.** Тут мы павінны ісьці як па лініі рэканструкцыі флёту, так і па лініі асваеньня новых, палепшаньня існуючых водных шляхоў, мэханізацыі пагрузачна-разгрузачных работ і будаўніцтву абсталяваньня па апошнім слове тэхнікі рэчных і марскіх партоў. Мэханізаваць, пабудаваць кучасныя парты—адна з важнейшых задач па рэканструкцыі водняга транспарту. Увага павінна быць зьвернута побач з разьвіцьцём існуючых водных шляхоў (Волокага, Дняпроўскага і інш.) на разьвіцьцё морскага і рэчнага суднаходзтва ў раёнах, дзе водныя шляхі слаба разьвіты, ня гледзячы на тое, што зьяўляюцца па-сутнасьці лепшымі з важнейшых сродкаў зносін. Я маю на ўвазе ДВК, Сібірскі край, Заходнюю і Усходнюю Сібір.

Выключна важнае значэньне ў другім пяцігодзьдзі прымае разьвіцьцё **дарожнага і шасэйнага будаўніцтва,** якія павінны разгрузіць чыгуначны транспарт ад перавозак на кароткія адлегласьці і падрыхтоўваць да асваеньня новых прамысловых і с.-г. раёны. Дарожнае і шасэйнае будаўніцтва мае яшчэ большае значэньне, што пры нашай буйнай сельскай гаспадарцы без наладжаных дарог абсалютна нельга аўладаць працэсам вытворчасьці і нельга дасягнуць патрэбных эканамічных вынікаў ад уборкі ўраджаю.

Паветраныя зносіны павінны быць разьвіты вельмі моцна ў другім пяцігодзьдзі. Ужо вызначана вельмі вялікая праграма па авіябудаўніцтве. Будоўцца авіяцыйныя заводы, будуюцца заводы авіяцыйных матораў, будуюцца дапаможныя прадпрыемствы. Паветраны транспарт атрымае вялізарную базу для свайго разьвіцьця і ў канцы пяцігодзьдзя будзе адным з магутных сродкаў для зносін буйных цэнтраў з далёкімі раёнамі, для перавозкі транспартабельных грузаў, пошты і г. д.

Вялікае разьвіцьцё павінна атрымаць **сувязь** усіх відаў, асабліва тэлефонная і радыё.

Гэты вучастак у нас знаходзіцца зараз на вельмі нізкім узроўні разьвіцьця. Між тым падрыхтоўка добрабыту насельніцтва, рост культурных запатрабаваньняў, вялізарны рост усяе народнае гаспадаркі і тавараабароту, актыўнасьць усяго народна-гаспадарчага жыцьця краіны,—усё гэта ўпіраецца ў неабходнасьць ва што-б та ні стала падцягнуць сувязь да таго ўзроўню, якога дасягнулі астатнія галіны народнае гаспадаркі.

Рэканструкцыя не павінна абыйсьці і такую галіну народнае гаспадаркі, які **савецкі гандаль.** Разгортваньне гандлю патрабуе поўнай тэхнічнай рэканструкцыі яе базы—патрабуе шырокага разгортваньня буйнаўніцтва спэцыялізаваных, тэхнічна абсталяваных складаў, якія даюць магчымасьць беражліва і добра захоўваць усе прадукты, халадзільнікаў, мэбазавозаў, спэцыяльнага гандлёвай сеткі і г. д. Тут паўстае таксама вялізарная рэканструкцыйная праблема, якой мы ня можам не заняцца ў другім пяцігодзьдзі, калі мы хочам паставіць справу савецкага гандлю такім чынам, каб абслугоўць усе патрэбы працоўнага насельніцтва на аснове прыстасаваньня ўсёй гандлёвай сеткі да ўстаў, выгодаў і патрэбаў пакупнікоў.

Вось у агульных рысах тыя лініі разьвіцьця, якія намячаюцца для важнейшых галін народнае гаспадаркі ў другую пяцігодку.

Разьвіцьцё раёнаў у другім пяцігодзьдзі

Я бяру зараз на сябе даволі трудную задачу—даць агульныя малюнак разьвіцьця народнай гаспадаркі па асобных вобласьцях і краёх. Гэтая задача тым больш трудная, што работа над выпрацоўкай пяцігадовага пляну знаходзіцца яшчэ ў першапачатковай стадыі.

Я, зразумела, павінен абмежыцца, што гэты раёны разрэз пяцігодкі вельмі арыентавальны.

Я буду без абмовак і цьвёрда гаварыць аб тых будаўніцтвах і работах, якія, будучы пачаты ў першым пяцігодзьдзі, пераходзяць сваім скончэньнем у другую пяцігодку, і буду рабіць адпаведныя агаворкі, калі гутарка ідзе аб патрэбных намётцах, якая павінна старанным чынам апрацоўвацца разам з вобласьцямі і краямі з улікам агульных народнагаспадарчых інтарэсаў і толькі пасьля гэтага можа ўвайсьці ў праектаваньне другога пяцігадовага пляну.

Абавязковасьць складаньня пяцігадовага пляну ў абласным і краявым разрэзе пацьвярджаецца яшчэ наступнай акалічнасьцю. Ужо ў першай пяцігодцы мы ўступілі на шлях будаўніцтва ня толькі асобных прадпрыемстваў, існаваньне якіх па сутнасьці магло-б мець месца ў любым раёне, але і на шлях будаўніцтва камбінатаў, якія абавязкова павінны абапірацца на шырокую энэргетычную і сыравінную базу, і, будучы камбінатамі, г. зн. аб'яднаньнем цэлага раду вытворчасьцяй, яны павінны прадбачыць іншы раз некалькі відаў сыравіны, робячы моцны ўплыў на ўсю эканоміку раёну.

Другое пяцігодзьдзе будзе пераважна будаўніцтвам гэтых камбінатаў, якія ў сваю чаргу выклікаюць неабходнасьць у адпаведных вобласьцях пацягваньня адной вытворчасьці да другой. Калі будуецца вялізарны мэталюргічны завод, трэба тут-жа знайсьці месцазаляганьне вапняку і арганізаваць яго распрацоўку. Калі будуецца буйны мэталюргічны завод—абавязкова павінны быць пабудаваны там і мясакамбінат і ў кожным выпадку хлебазавод і г. д. і г. д. Адным словам, будаўніцтва гэтых буйных камбінатаў-гігантаў, якія выклікаюць па сутнасьці адразу-ж арганізацыю буйнога прамысловага цэлага гораду, абавязкова павінна спалучацца з праектаваньнем усёй эканомікі данага раёну, данай вобласьці.

Гэтая тэндэнцыя будаўніцтва буйных камбінатаў, буйных прадпрыемстваў, складаючых комплекс вытворчасьці, будзе, відома, яшчэ больш узмоцнена ў другім пяцігодзьдзі. Таму адрэзаць праектаваньне другога пяцігадовага пляну ад раённага разрэзу, ад абласнога разрэзу, было-б ня толькі нэгарэльна, але і зьвязана з вялікімі небясьпекамі, бо мы атрымалі-б цэлы рад мясцовых дыспрапорцый у паасобных раёнах, якія потым мы павінны былі-б насьпех выпраўляць.

Агульны абём капітальных работ на ўсіх галінах народнай гаспадаркі на другое пяцігодзьдзе вырысоўваецца ў суме парадку 140-150 млрд. руб. Гэта такі вялізарны маштаб будаўніцтва, што мы павінны з асаблівай увагай зацікавіцца да пытаньняў геаграфічнага разьмяшчэньня прамысловасьці і дасягць раз прымерыць, раней чым адрэзаць, раней чым рашыць, дзе будаваць той ці іншы завод. Гэтая акалічнасьць павінна таксама быць прынята пад увагу. І калі я ўжо на данай стадыі работы заклаваюся за пабудову таго ці іншага прадпрыемства і разьвіцьцё той або іншай галіны прамысловасьці ў тым ці іншым краю або вобласьці, гэта яшчэ ня значыць, што гэта—канчатковыя прапановы да складаньня пляну. Будзе ўважана, дзе лепш, дзе будзе больш рацыянальна пабудаваць той ці іншы завод. Пры гэтым мы ні ў якім выпадку не павінны кідаць буржуазным разьмеркаваньнем рэн табельнасьці. Мы будзем кіравацца інтарэсамі сацыялістычнай гаспадаркі ў цэлым.

З гэтага пункту погляду тое або іншае будаўніцтва будзе мэтазгодна ў даным раёне з пункту погляду перавозкі грузаў, блізкасьці сыравіны, з пункту погляду згрупаваньня кваліфікаванай рабочай сілы, з пункту погляду наяўнага гатовага жыльлёвага фонду і г. д., і г. д. У другім месцы гэта можа быць менш выгодна для народнай гаспадаркі. Таму гэта ўсё павінна быць яшчэ ўважана, увязана, і толькі пасьля гэтага канчатковы эканамічны твар кожнага краю будзе высьветлены.

Пераходжу да агляду па вобласьцях. Пачну з Далёкага Усходу.

Далёка-Усходні край, які за першае пяцігодзьдзе разьвіваўся слаба ў параўнаньні з іншымі вобласьцямі, павінен на працягу другога пяцігодзьдзя набыць найбольш шпаркія тэмпы разьвіцьця. Ён павінен спаўраць у сябе ўласную моцную індустрыяльную базу, шляхам пабудовы сярэдняга ты пу мэталюргічнага заводу, які павінен цалкам абслугоўць патрэбы Далёкага Усходу. Я маю на ўвазе Сучанскі завод, на сучанскіх вугалях, які добра каксуюцца, і на Вольгінскім месцазаляганьні жалезных руд, якія знаходзяцца недалёка ад Сучана. Гэта дасьць магчымасьць Далёкаўсходняму краю вызваліцца ад залежнасьці ад уральскай мэталюргіі, што вельмі важна з народна-гаспадарчага пункту погляду.

Сапраўды, транспарт мэталю на Далёкі Ўсход—гэта эканамічная недарэчнасьць пры наяўнасьці там сваіх добрых жалезных руд. У Далёкаўсходнім краі павінна разьвівацца магутнае судабудаўніцтва. Значэньне гэтай справы зусім зразумела. Павінны быць разьвіты і палепшаны ўсе віды транспарту, асабліва бязрэйкавы і рэчны, які там знаходзіцца на вельмі нізкай ступені разьвіцьця. На Далёкім Усходзе, як нідзе, набываюць разьвіцьцё паветраныя шляхі зносін. Павінны быць умацаваны рыбапромысловасьць і каперавая справа. У галіне сельскай гаспадаркі апрача разьвіцьця зярнёвай гаспадаркі і жывёлагадоўлі, там павінны разьвівацца лён, канопля, цукровыя буракі і на гэтай базе—прамысловасьць, пераапрацоўваючая гэтыя віды сельска-гаспадарчай сыравіны,—цукровыя заводы, лёна-пяньковыя заводы і г. д., і г. д. Неабходна дабіцца, каб Далёкаўсходні край стаў на ўсіх

ДАКЛАД тав. КУЙБЫШАВА АБ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДЦЫ

на Урале. Яна размешчана на Урале і цесна звязана з Урала - Кузнецкім камбінатам. У Башкірскай рэспубліцы разьвіваецца буйная прамысловасьць. Да той мэталюргічнай вытворчасьці, якая там ёсьць у в'дзе Беларэцкага заводу, дадаецца новы магутны завод Камарава - Зігазінскі, які мае ўсе падставы для таго, каб быць уключаным у другую пяцігодку і ў другой пяцігодцы быць скончаным.

Але, апрача таго, там разьвіваецца і каляровая мэталюргія. На базе гэтай сыравіны мэтазгодна ў Башкірыі пачаць узмоцненым тэмпам разьвіваць машынабудаўніцтва. Як відаць, там будзе пабудован завод электравозаў для рэканструкцыі чыгунак. Там будзе будавацца буйны маторны завод. Відавочна, калі будзем абгаворваць пытаньне аб месцы для будаўніцтва вялікага катлатурбінага заводу, пункт будаўніцтва будзе абраны ў Башкірыі. Поруч з гэтым разьвіваецца і лёгкая перапрацоўчая прамысловасьць і харчовая індустрыя. На базе ўзрастаючай сельскай гаспадаркі па лініі скуранай, мясной і тэкстыльнай прамысловасьці, бо там ёсьць льняная культура.

Цяпер крыху зьмяніўшы кірунак на захад дазвольце спусьціцца на наш дальні поўдзень — Захаўказьзе, каб акінуць гэты раён, закончыць апісаньне новых прамысловых раёнаў, да гэтага часу крайня слаба разьвітых. Закаўказьзе будзе разьвіваецца ў асноўным па тых лініях, якія намеціліся ўжо ў першай пяцігодцы, у прыватнасьці сельская гаспадарка яго ў ідзе далей ёсьці па лініі разьвіцьця тых тэхнічных культур, якія ўласьцівы там чаму клімату, перш за ўсё базоўна і ўкараненьне цэлага раду іншых субтрапічных культур — чай, рамі і інш. Зусім відавочна, што задача разьвіцьця і такіх культур, як вінград, памэранцы, мачларыны, так сам павінны стаяць перад Закаўказьзем так, як і задача разьвіцьця лімонных плянтацый. Я ня думаў, каб трэба так зьневажальна адносіцца да гэтых культур, бо, у кожным выпадку, у гэтым пяцігодзьдзі мы будзем мець такое становішча, калі ні вінград, ні памэранцы, ні мандарыны ня будуць прадметам раскошы, яны будуць прадметам масавага спажываньня і работа над гэтымі культурамі для Закаўказьзя зьяўляецца работай вельмі важнай з пункту погляду ўсёй народнай гаспадаркі.

Разьвіцьцё буйнай прамысловасьці Закаўказьзя будзе ісьці вельмі інтэнсыўна, у выніку чаго мы будзем мець значную індустрыялізацыю гэтага краю. Здабываньне нафты ў новых раёнах Закаўказьзя павінна будзе да сягнуць 10 млн. тон, апрача Баку. Мажліва гэта праектыроўка вялікая, яна, вядома, павінна будзе падпасьці вялікай і вялікай праверцы, але магчымасьці для гэтага там ёсьць.

Здабываньне каменнага вугалю ў Закаўказьзі даходзіць да 3 млн. тон. (Ткварчэлы плюс Ткібулы), разьвіваецца горназдабываючая прамысловасьць, каляровая мэталюргія, медзь, у Зангезурах, алюміній з алюнітаў у Азэрбэйджане, разьвіваецца лёгкая прамысловасьць па пераапрацоўцы тэй сыравіны, якая вытвараецца на тэрыторыі Закаўказьзя.

Асабліва вялікае значэньне набывае пабудова Ашкесанскага мэталюргічнага заводу, які поруч з выпрацоўкай чыгуну будзе мець трубны цэх для забесьпячэньня трубамі бакінскай і наогул закаўказкай нафтапрамысловасьці, а з другога боку, будзе даваць мэталь для досыць буйнага машынабудаўніцтва, якое ёсьць у Закаўказьзі, якое ня прыкметна вырасла за гады першага пяцігодзьдзя (завод імя Шмідта) і г. д. У частцы хіміі— будуюцца прадпрыемствы фасфарытных і азоцістых угаснаньняў.

Буйнае разьвіцьцё атрымлівае прамысловасьць будаўнічых матар'ялаў, цэмант, туф і г. д.

Тэкстыль разьвіваецца па лініі бавоўнянай прамысловасьці і шоўку.

Магутную энэргетычную базу ЗСФСР атрымлівае ў в'дзе раду гідраэлектрастанцый. У якасьці магчымых пунктаў будаўніцтва я назаву Церцер, Мангечаур, Храм, Косы-Гюмуш і інш.

Задачы ў галіне транспарту ня вычэрпваюцца задачамі электрафікацыі, там відавочна, прыдзецца праводзіць некаторыя дадатковыя чыгункі.

Цяпер зноў варочаемся да руху на захад.

ПАВАЛОЖЖА. Эканоміка абласьцей Паваложжа на працягу другога пяцігодзьдзя рэзка зьменіцца ў сувязі з работамі па рэканструкцыі рэк басэйну Волгі. Ажыцьцяўленьне рэканструкцыі Волгі пачнецца пабудовай гэблі і гідрастанцый у Яраслаўлі для забясьпечаньня прамысловасьці Іванаўскай вобласьці, і ў Ніжняга Ноўгароду, для патрэб Ніжагародзкага краю. Да моманту распрацоўкі пляну другога пяцігодзьдзя мы павінны прапрацаваць пытаньне аб пабудове раду гэбляў на прытоках Волгі (Кама, Ака) і аб правядзеньні ўсёй сыстэмы рэк Верхняй Волгі і каналаў у абсалютна сучасным стан. У працягу пяцігодзьдзя павінны быць закончаны ўсе вышукальныя падрыхтоўчыя работы па гэблях на сярэдняй і ніжняй плынь Волгі, з магчымым пры стугом да работ па адмэй з гэтых гэбляў. Далейшая прапрацоўка гэтага пытаньня пакажа, якое рашэньне мы зможам прыняць для другога пяцігодзьдзя, ці зможам мы падняць на Волзе яшчэ дадатковую гэблю, апроч двух, якія будуць пабудаваны ля Ніжняга і ля Яраслаўлю.

Цяпер па пасобных абласьцях.

У НІЖАГАРОДЗКІМ КРАІ. Побач са скончаньнем будаўніцтва пачатых машынабудаўнічых заводаў і разьвіцьцём аўтамабільнага заводу разьвіваецца тукавая прамысловасьць, хімічная прамысловасьць наогул, будуюцца лесахімічны завод, папяровыя прадпрыемствы. Ніжагародзкі край ператвараецца ў буйны цэнтр машынабудаўнічай і суднабудаўнічай прамысловасьці. На самай справе, ужо ў першую пяцігодку мы вельмі многа пабудавалі і пачалі будаваць там машынабудаўнічых заводаў.

Там будуецца вялікі станкабудаўнічы завод, авіяцыйны завод, там будуецца і па-сутнасьці ўжо пушчаны аўтамабільны завод. Там ёсьць рэканструяваньня іншыя машынабудаўнічыя заводы. Там — Сормаўскі завод, які рэканструюецца і пасьля рэканструкцыі будзе станавіць сабой адзін з самых вялікіх нашых машынабудаўнічых заводаў. Але апроч таго, што Ніжагародзкі край будзе цэнтрам буйнага машына і судабудаўніцтва, ён будзе канцэнтраваньнем і хімічнай прамысловасьці ў выглядзе свайго Чэрварэчанскага заводу і новых хімічных заводаў, якія там будуць будавацца, канцэнтраваньнем лясной, лесапрацоўчай прамысловасьці, папяровай, лесахімічнай.

Энэргію для Ніжагародзкага краю будуць даваць торф і гідраэнэргія Волгі.

Сельская гаспадарка краю разьвіваецца па лініі жывёлагадоўлі і тэхнічных культур. Зразумела, і збожжавыя культуры падлягаюць у гэтым краі далейшаму разьвіцьцю.

У ТАТРЭСПУБЛІЦЫ намячаецца пабудова заводу сінтэтычнага каўчуку, магчыма, заводу авіяцыйных матэрыяў, цэмантна - кіслотнага тукавага камбінату ў Камскай вытоцы на адпаведнай сыравіне, намячаецца пабудова заводу пластычных мас, відавочна дрэвапрацоўчая справа і лясная справа наогул. Энэргію гэтыя прадпрыемствы і гэтыя заводы будуць атрымліваць з Волска-Камскай гідрастанцыі.

СЯРЭДНЯВОЛСКІ КРАЙ. Тут разьвіваецца буйная прамысловасьць на базе тых сыравінных багацьцяў, якія мае гэты край. Перш за ўсё, я назаву пабудову Хвалаўскага мэталюргічнага заводу і нікелевага заводу. Разьвіваецца супэрфасфатная прамысловасьць, разьвіваецца хуткімі тэмпамі сланцавая прамысловасьць з пабудовай сланцавых камбінатаў для перагонкі здабываемых сланцоў. Пры гэтым электраэнэргія будзе атрымлівацца таксама на базе выкарыстаньня сланцу.

Для пераапрацоўкі прадукцыі сельскай гаспадаркі ў Сярэдняй Волзе будуюцца цукровыя заводы, мясакамбінаты, вауняная вытворчасьць, арганізуецца пяньковая вытворчасьць. Будуецца завод сынтэтычнага каўчука ў Сызрані. Вобласьць набывае характар закончанага аграрна - індустрыяльнага камбінату з моцна разьвітай сельскай гаспадаркай па лініі збожжавых і тэхнічных культур, жывёлагадоўлі і ў той-жа самы час з вялікімі тэмпамі разьвіцьця прамысловасьці.

У НІЖНЯВОЛСКІМ КРАІ, апроч тых заводаў, якія будаваліся і будуюцца ў першую пяцігодку, і далей будзе працягвацца разьвіцьцё мэталюргічнай і машынабудаўнічай прамысловасьці Сталінграду. Магчыма, будаўніцтва Хоперскага мэталюргічнага заводу. Апроч таго, у Астрахані павінна быць пабудавана суднабудаўнічая вэрф для будаўніцтва рыбалоўчых суднаў, буйнейшы мясакамбінат павінен быць пабудаваны ў Пакроўску, рыбнакансэрвовыя заводы — у Астрахані. На лініі машынабудаўніцтва намячаецца пабудова заводу боеснага абсталяваньня.

Па галіне транспарту апроч магчымага будаўніцтва каналаў Волга-Дон, Маныч, аб якіх я ўжо гаварыў, якія вельмі рашучым чынам зьмяняюць твар краю, будуецца і цэлы рад чыгунак.

УКРАІНСКАЯ РЭСПУБЛІКА. Украіна застаецца буйным прамысловым і земляробчым раёнам Саюзу; працягваючы разьвівацца па тых жа лініях, якія намеціліся за першае пяцігодзьдзе. Здабываньне вугалю ўзрасьце ў Донбасе да 110—120 млн. тон, будуюцца новыя апалавыя электрастанцыі, завяршаючыя сабой пабудову Украіна-Паўночна-Каўказкага энэргакольца, магутнасьцю каля 3 з палов. млн. кілёват устаноўленай магутнасьці; вытворчасьць чыгуну на Поўлні расьце да 11 млн. тон, г. зн., ня гледзячы на тое, што Украіна крыху трацінь сваю ўдзельную вагу ў вытворчасьці і вугалю і чыгуну, тэмп росту для чыгуну і вугалю бярэцца такі, які робіць Украіну настолькі індустрыяльнай вобласьцю, што яна будзе выпрацоўваць мэталю больш, чым уся наша краіна павінна здабыць у 1932 годзе.

Моцна ўзрастае хімічная прамысловасьць, асабліва азотная, вытворчасьць фасфарытных угнаеньняў. Вялізарны рост атрымлівае вытворчасьць якасных сталяй для машынабудаўніцтва, што павінна быць асабліва рашуча падкрэсьлена. Магутна разьвіваецца машынабудаўніцтва—горнаазводзкае абсталяваньне, якое будзе выпрацоўвацца на старым і новым Краматорскіх заводах, паравозабудаўніцтва, якое будзе ажыцьцяўляцца на старым і новым Луганскіх заводах і ХПЗ, вагонабудаўніцтва на заводзе імя «Правды», суднабудаўніцтва на Мікалаеўскім заводзе, на Адэскім і Севастопальскім заводах і на новым Марыўпальскім, трактарабудаўніцтва, электрамашынабудаўніцтва.

Хімічная апаратура будзе выпрацоўвацца, галоўным чынам, на кіеўскім заводзе «Бальшавік», павінна быць разгорнута вытворчасьць абсталяваньня для цукровых заводаў. У частцы лёгкай прамысловасьці разьвіваюцца цукар, пянька, мясная, бавоўняная прамысловасьць у новых бавоўняных раёнах.

З поўнай магутнасьцю будуць працаваць Дняпроўская гідрастанцыя і Дняпроўскі камбінат, што будзе вялізарным укладам у гаспадарку Савецкага саюзу і вельмі зьменіць эканоміку ўсёй Украіны.

Разьвіцьцё чыгунак пойдзе па лініі электрафікацыі, пракладкі другіх шляхоў, абсталяваньня сартыравальных станцый і новага чыгуначнага будаўніцтва.

Сельская гаспадарка Украіны павінна разьвівацца па тых напрамках, якія былі да гэтага часу, г. зн. поруч з зярнёвай, тэхнічнай гаспадаркай, Украіна павінна павялічыць вытворчасьць тэхнічных культур і ў галіне цукровых буракоў, і ў галіне канапель, і ў галіне бавоўны.

ПАЎНОЧНА-КАЎКАЗКІ КРАЙ у другім пяцігодзьдзі захоўвае свае характэрныя рысы раёну, злучаючага буйную таварную сельскую гаспадарку, галоўным чынам у галіне тэхнічных культур, з разьвітай здабываючай і перапрацоўваючай прамысловасьцю. Асноўнымі галінамі прамысловасьці ў пляне зьяўляюцца нафта і вугаль. Мяркуецца, што па ўсіх нафтавых раёнах Паўночна-Каўказкага краю ў канцы пяцігодкі павінна быць здабыта 22—30 млн. тон нафты, у тым ліку па Грознафце 17—18 млн. тон (уключаючы сюды дагестанскую нафту і Бэнойскі раён), і па Майкопскай нафце—11—12 млн. Па вугалю ўдзельная вага «Севкавугалю» у здабычы па Донбасе павінна ў пяцігодцы павялічыцца, і па папярэдніх падліках здабыча вугалю павінна скласьці прыблізна 15 млн. тон. Разьвіваецца каляровая мэталюргія—паліметалі, цынк, волава, ставіцца вытворчасьць алюмінія на Сулакскай гідрастанцыі. Па машынабудаўніцтве, апрача маючыхся ўжо заводаў, пабудаваных зараз Россельмаша і Роскамбайнбуду, магчыма пабудова аўтазборачнага заводу, магчыма пабудова заводу транспартных машын і рэканструкцыя цэлага раду старых заводаў. У галіне хіміі будуць будавацца супэрфасфатныя заводы, заводы па скарыстаньні натуральных газаў (Дубэнт) і мясцовых вугляў для выпрацоўкі азоту. У галіне сельскай гаспадаркі поруч з вытворчасьцю пшаніцы Паўночна-Каўказкі край становіцца адным з асноўных раёнаў па выпрацоўцы тэхнічных культур, пры чым манапольнае становішча ён займе па італьянскай канаплі і кенафу. Апрача таго, вялікае разьвіцьцё павінна атрымаць непаліўная бавоўна, цукровыя буракі, соя, клецінавіна, садоўніцтва і г. д. Адпаведна з гэтым расьце пераапрацоўчая прамысловасьць, будуюцца рад кансэрвовых і цукровых заводаў, кенафная фабрыка і г. д. Энэргетычную базу Паўночна-Каўказкі край атрымае ў в'дзе двух вялікіх электрастанцый: адна—Сулакская гідрастанцыя і другая Белая Калітва на штыбу. Станцыі гэтыя намечаны папярэдня, канчатковае рашэньне будзе тады, калі мы будзем канчаткова складаць другую пяцігодку. Будзе разгорнута вялікае транспартнае будаўніцтва і ў галіне чыгуначнага транспарту і ў галіне водна-га транспарту. Заканчваюцца работы па морскаму качалу і будаўніцтве порту ў Растове і пашыраецца судаходнасьць Дону.

Цяпер я пераходжу да наступнай вобласьці — **ЦЭНТРАЛЬНА-ЧОРНАЗЁМНАЙ ВОБЛАСЬЦІ.**

Тут моцна расьце энэргетычная база, агульная магутнасьць электрастанцый па прыблізных падліках павінна дайсьці да 350 тыс. кілёват. Атрымлівае далейшае разьвіцьцё чорная мэталюргія ў выніку ўводу ў эксплёатацыю новых доменных печаў на Ліпецкім заводзе. У другой-жа пяцігодцы павінна быць праведзена шырокая падрыхтоўка да індустрыяльнага асваеньня магутных жалезарудных заляганьняў Курскай магнітнай анамаліі.

Па лініі машынабудаўніцтва, поруч з рэканструкцыяй існуючых машынабудаўнічых заводаў, магчыма, будзе пабудованы вагонабудаўнічы завод у Варонежы. Значнае разьвіцьцё павінна атрымаць прамысловасьць, якая перапрацоўвае сельскагаспадарчую сыраціну: павінны быць пабудаваны новыя цукровыя заводы, маслабойныя, эфіра-маслабойныя, вяровачна-шпагатныя; рад новых броваряў. Разьвіта пенька-ткацкая вытворчасьць.

Поўнай магутнасьцю будзе працаваць завод сынтэтычнага каўчука і, акрамя таго, магчыма будзе пабудованы новы завод.

Значнае разьвіцьцё павінна атрымаць сьвінагадоўля, яйка-птушнічная справа і галіны прамысловасьці, якія базуюцца на гэтай аснове.

У галіне новага чыгуначнага будаўніцтва намечана будаўніцтва некаторых ліній. Асноўныя работы ў галіне чыгуначнага транспарту прыпадаюць на электрыфікацыю курскага напрамку, харчуючага індустрыяльныя цэнтры данецкім вугалем.

МАСКОЎСКАЯ ВОБЛАСЬЦЬ. Працэс ператварэньня Маскоўскай вобласьці з тыпова тэкстыльнага раёну ў раён машынабудаўніцтва, электратэхнікі і хіміі, які шырока разгарнуўся ўжо ў першым пяцігодзьдзі, павінен быць паглыблены і замацаваны ў другім пяцігодзьдзі.

Здабыча па Падмаскоўскім басэйне павінна быць даведзена да 25 млн. тон вугалю.

Значна ўзмацніцца і пашырыцца сетка электрастанцый як шляхам пашырэньня існуючых, так і шляхам уводу ў эксплёатацыю электрастанцыі ў Бобрыках магутнасьцю ў 300 тыс. квт., Фрунзэўскай—у 150 тыс. квт., якія працуюць на падмаскоўным вугалі, і Тверской магутнасьцю ў 150 тыс. квт., якая працуе на оршынскім торфе.

Да 1937 году ў Маскоўскай вобласьці будуць працаваць, апроч Нова-Тульскага і Касагорскага заводаў, дзьве доменныя печы на пірытных згарках.

Лінія разьвіцьця электратэхнічнай прамысловасьці і машынабудаўніцтва вызначаецца необходнасьцю спэцыялізацыі Маскоўскай вобласьці, на адказных відах вытворчасьці, што павінна прывесьці не столькі да будаўніцтва новых прадпрыемстваў, сколькі да спэцыялізацыі і канцэраваньня існуючых з мэтаю асваеньня перадавой тэхнікі.

У другім пяцігодзьдзі намячаецца магутнае разьвіцьцё хімічнай прамысловасьці. У прыватнасьці ўвойдуць у эксплёатацыю заводы Прэцыпітату, падвойнага супэрфасфату, нітрофасфату, а таксама рад заводаў па выробе аміяку этэдам канцэрсіі.

Асноўныя лініі спэцыялізацыі сельскае гаспадаркі знаходзяцца ў вельмі цеснай залежнасьці ад яскрава выяўленага індустрыяльнага характару раёну і глеба-кліматычных умоў яго. Яны ў асноўным зводзяцца да лёнагадоўлі, бульбагадоўлі і гародніцтва, а таксама да інтэнсыўнай жывёлагадоўлі малочна-мясного напрамку.

Вялізарная роля Масквы, як разьмеркавальна - транзітнага цэнтру, патрабуе арганізацыі магутнага разьмеркавальнага транзітнага кальца чыгунак на аснове электрыфікацыі гэтага кальца, Маскоўскага вузла і прыгарадных сувязі.

Рашучыя зрухі павінны быць дасягнуты ў справе скарыстаньня водных шляхоў зносін у асабліва сці вяр хоўя Волгі і яе прытокаў. Вырашэньне транспартнай праблемы ў гэтай яе частцы будзе суправаджацца вырашэньнем праблемы водазабясьпечаньня Масквы.

Масква ў зьвязку з вялізарным камунальным і жыльлёвым будаўніцтвам зробіцца буйнейшым і найбольш упадрадкаваным пралетарскім цэнтрам СССР.

ІВАНАВА - ПРАМЫСЛОВАЯ ВОБЛАСЬЦЬ. Гістарычна складзеная выключная спэцыялізацыя ІПВ па лініі бавоўнапапяровай прамысловасьці ня можа захавацца палкам на другое пяцігодзьдзе, бо як правіла, новы бавоўнапапяровай прамысловасьці ня гэтай вобласьці будавацца ня будуць. Існуючыя-ж бавоўнапапяровыя прадпрыемствы павінны ў другой пяцігодцы падпадаць рашучай рэканструкцыі з мэтай іх спэцыялізацыі на высокаякасных тканінах асабістага спажываньня, экспартных тканінах і тэхнічных у асабліва сьці. У вобласьці павінны таксама атрымаць разьвіцьцё прадпрыемствы, выробляючыя выраб ы з тэхнічных тканін, так у прыватнасьці намечаны да пабудовы завод пажарных рукавоў. Значнае разьвіцьцё атрымае дагэтуль адстаючая перапрацоўка лёну ў форме будаўніцтва сеткі прадпрыемстваў па першапачатковай апрацоўцы лёну і раду лёнакамбінатаў. Адсталая энэргетычная база вобласьці значна ўзмацнее ў выніку ўвядзеньня ў эксплёатацыю Яраслаўскай гідрацэнтралі і пабудовай раду цеплавых станцый.

У другім пяцігодзьдзі павінны быць умацаваны і створаны новыя галіны прамысловасьці, разьвіцьцё якіх зьмяніць характар ІПВ. У ІПВ ёсьць дастатковыя прадпасылкі для разьвіцьця тэкстыльнага машынабудаўніцтва, суднабудаўніцтва, аўтабудаўніцтва і хіміі. Магутнае разьвіцьцё ў вобласьці павінна атрымаць хімічная прамысловасьць шляхам далейшага разьвіцьця гумовага камбінату і сумежных з ім галін, пашырэньне лакафарбовачнай прамысловасьці, прамысловасьці штучнага валакна, а таксама стварэньня ўласнай тукавай прамысловасьці на базе скарыстаньня месцарадоў фасфарытаў раёнаў Кастрамы, Кінешмы і р. Чыні. Лясныя багацьці вобласьці стаяць за ўвесь рост праблему разьвіцьця папяровай прамысловасьці, а таксама галіны працуючых на адыходах лесапераапрацоўкі, лесахіміі асабліва. Ня менш значныя пэрспэктывы і ў галіне торфахіміі.

Сельская гаспадарка вобласьці павінна і ў другім пяцігодзьдзі спэцыялізавацца на вытворчасьці лёну і асабліва разьвіць гароднічтва; жывёлагадоўля павінна характарызавацца мясамалочным напрамкам.

Значнай рэканструкцыі павінны пад пасьці водныя шляхі зносін у сувязі з будаўніцтвам гідраэнэргаці, якія забясьпечаць б сувязь з сярэдн'м і ніжным цячэньнем Волгі, а таксама з рэканструкцыяй Марыінскай сыстэмы.

ЛЕНІНГРАДСКАЯ ВОБЛАСЬЦЬ. Ленінградзкая вобласьць на працягу другога пяцігодзьдзя працягвае заставацца буйнейшым машынабудаўнічым цэнтрам і вобласьцю выробу тэхнічных культур. Асабліва трэба падкрэсьліць пянэрную ролю Ленінграду ў асваеньні перадавой тэхнікі і насажэньні ў нова зьвучаемых раёнах новых вытворчасьцяй. Энэргетычная база папаўняецца разьвіцьцём здабычы сланцаў і баравацких гуклаў і пабудовай раду новых электрастанцый на азёрнай сыстэме на поўначны-захад ад Петразаводзку, на рэках вобласьці, і ў прыватнасьці Карэла-Мурманскага краю. Будуецца другая Сьвір на 140 т. клвт., гідрастанцыі на р. Ніве 75 т. клвт., на р. Ніве 112 т. клвт., на стоцы возёра Выг 105 т. клвт. і цеплаэлектрацэнтраль Маскоўска-Нарвскага раёну на тарфяным і мясцовым апалах. Мэталюргія краю папаўняецца пабудовай магутнага перадзельнага заводу для вырабу якасных сталяй для ленінградзкага машынабудаўніцтва, працуючага на ломе Ленінградзкай вобласьці, алюмінієвая вытворчасьць краю пашыраецца шляхам пабудовы алюмінієвага камбінату, працуючага на нэфэлінах і на энэргіі Нёўскай гідрастанцыі, пашыраецца вытворчасьць апатытаў Хібінскага камбінату, пачынаецца асваеньне разьмешчаных на захад ад Мурманскай чыгункі, ў раёне Хібін полімэталічных месцародаў, будуюцца лясныя камбінаты і цэлюлёзна-папяровыя камбінаты. Буду юцца заводы фасфарытных угнаеньняў.

Чыгуначная сетка Ленінградзкай вобласьці пашыраецца шляхам пабудовы раду падъязных шляхоў і ветак Мурманскай дарогі, якая зьвязвае яе з паўэбярэжжам.

У сувязі з ростам рыбнай прамысловасьці, будуюцца новыя рыбныя базы і кансэрвавыя заводы.

Рост тэхнічных культур і жывёлагадоўлі выклікае неабходнасьць пабудовы побач з мясакамбінатамі масларобчых заводаў і заводаў па першапачатковай перапрацоўцы лёну, як гэдзе для патрэб існуючай прамысловасьці Ленінграду на экспарт.

Гор. Ленінград ператвараецца ў зусім сучасны і дабрабытны ў адпаведнасьці з навейшай гаразкой тэхнікай пралетарскі цэнтр.

Пэрспэктывы разьвіцьця Ленінградзкай вобласьці былі-б няпоўна мною абмалёваны, калі-б я не ўспамянуў аб намячаемай апалавай і мэталюргічнай базе Ленінграду.

У КАРЭЛЬСКАЙ РЭСПУБЛІЦЫ выкрыты залежы мінэрала—шунгіта, які, як відаць, зможа адыграць рэвалюцыйную ролю ў эканоміцы Ленінграду, Карэліі і Мурманскага краю. Ужо знойдзены мэтады спальваньня шунгіта, прычым выяўлена, што ў попеле пасьля спальваньня знаходзіцца дарагі мэталь—ванады. Калі падцьвердзяцца даныя папярэдніх навукова-дасьледчых работ, дык Карэлія стане ня толькі крайнай лесу, папяровай і лесахімічнай вытворчасьці, але і крайнай, здабываючай высокакалёрый ны мінэральны апал для важнейшага машынабудаўнічага цэнтру нашай краіны (Ленінград).

Гэтым не вычэрпваюцца новыя пэрспэктывы разьвіцьця Ленінграду.

У МУРМАНСКІМ КРАІ знойдзены жалезныя руды. У другой пяцігодцы магчыма пабудова мэталюргічнага заводу, які будзе снабжаць Ленінград мэталям.

Лёгка зразумець выключнае значэньне гэтага факту ў эканоміцы Ленінграду і ўсёй краіны.

Мурманскі-ж край, раней багаты толькі рыбай, які абагацілся ў далейшым хіміяй (апатыты) і каляровай мэталюргіяй (алюміній з нэфэліну), пачне абмацаць стаць і буйным мэталюргічным цэнтрам, снабжаючым мэталям наш самы перадавы цэнтр машынабудаўніцтва.

Для задаволеньня патрэб індустрыяльнага будаўніцтва СССР плян павінен прадугледзіць шырокае вывучэньне лясных багацьцяў эўрапэйскай часткі Поўначы у прыватнасьці пабудову лесапапяровых і лесахімічных камбінатаў; адначасова неабходна прадугледзіць шырокае разгортваньне і скарыстаньне рыбных багацьцяў (кансэрвозыя заводы); прыступ да шырокай эксплёатацыі вуталёў багацьцяў Пячоры і выкапнёвых багацьцяў (каляровыя металі, графіт), а таксама праявядзеньне шырокага раду мерапрыемстваў па вывучэньні азіяцкай часткі Поўначы. Адна часова павінны быць улічаны задачы ўдыму гаспадарак народаў Поўначы на базе скарыстаньня і разьвіцьця мясцовых багацьцяў (аленяводзтва, паляваньне, тушыны промысел і г. д.).

Асноўным шляхам вывучэньня Поўначы зьяўляецца шырокае транспартнае будаўніцтва, якое павінна атрымаць зялёнае разгортваньне ў раёнах Поўначы ў другой пяцігодцы.

ЗАХОДНЯЯ ВОБЛАСЬЦЬ уладае магутнай энэргетычнай базай у выглядзе торфу, пры чым разьвіцьця чыгуначная сетка дае асабліва спрыяючыя магчымасьці для разьвіцьця ўсіх галін гаспадаркі ў вобласьці. Пагэтаму ў другім пяцігодзьдзі Заходняя вобласьць робіць вельмі вялікі крок у сваім індустрыяльным разьвіцьці. Цэнтральным мерапрыемствам для рэканструкцыі гаспадаркі Заходняй вобласьці зьяўляецца стварэньне электрастанцый на Жаркаўска Сьвіткім тарфяным масыве, як асноўе торфахімічнага камбінату і базы электрыфікацыі паўночнай часткі вобласьці. Заходняя вобласьць ужо цяпер зьяўляецца найбольш буйным лёна-канапляводным раёнам. Перапрацоўка лёну і далейшая перапрацоўка лёну (прадзеньне, ткацтва).

Сказанае мною ў адносінах пэрспэктыў гаспадарчага разьвіцьця асобных вобласьцяй і краёў сьведчыць аб вялізарным размаху будаўніцтва, якое павінна быць запраектавана ў другой пяцігодцы. Мы зробім вялікі крок наперад у справе асваеньня натуральных багацьцяў Саюзу, у справе разьвіцьця прадукцыйных сіл на ўсіх кутках нашай краіны.

Для таго, каб вырашыць гэтыя задачы, каб ажыцьцявіць праектыроўкі скарыстаньня натуральных рэсурсаў, як я падаюць па кожную з пасобных вобласьцяй, трэба разгарнуць вылючную работу па выведках і пошуках тых альбо іншых выкапняў. асабліва ў мала асвоеных у прамысловых адносінах раёнах. Пагэтаму пры распрацоўцы пляну 2 пяцігодкі неабходна запраектаваць такое разгортваньне геалёгавыведачных работ і стварыць такую матар'яльна-тэхнічную базу для іх, якія забясьпечылі-б цалкам вырашэньне гэтых задач і падрыхтавалі-б нашы выключныя натуральныя рэсурсы для іх усямернага прамысловага скарыстаньня і разьвіцьця вытворчасьці.

Узровень дабрабыту працоўных

Аднэй з цэнтральных задач пляну, на якую я ўжо зазначаў, зьяўляецца падвышэньне ўзроўню дабрабыту працоўных.* Новы пяцігадовы плян павінен быць распрацаваны такім чынам, каб гэтая задача атрымала найбольш поўнае і ўсебаковае выражэньне ва ўсіх праектыроўках пляну—як у адносінах узроўню харчаваньня, так і ў адносінах забясьпечаньня прамтаварамі, жыльлёва-камунальнага будаўніцтва, бытавога абслугоўваньня і г. д.

Вы ведаеце ўжо з тэзісаў, што мы лічым неабходным забясьпечыць у другой пяцігодцы такое разгортваньне вытворчасьці лёгкай і харчовай індустрыі і сельскае гаспадаркі, якое забясьпечыла-б павялічэньне норм спажываньня ня менш чым у 2-3 разы.

Прыкладныя падлікі норм душавога спажываньня ў 1937 годзе па пасобных найбольш важных прадуктах асабістага спажываньня дазваляюць нам сьцьвярджаць, што па ўзроўні спажываньня Савецкі Саюз будзе самай перадавой краінай сьвету, назоч на паказваючы ўсім працоўным, чаго можа дамагчыся рабочая клясa, якая стварае сацыялізм.

Пры агульным росьце спажываньня прадуктаў харчаваньня асабліва важна радыкальная зьмена структуры харчаваньня ў бок яе значнага палепшаньня, за кошт павялічэньня ў спажываньні долі найбольш пажыўных, найбольш лёгка ўсвояемых арганізмам чалавека прадуктаў. Асабліва значна павінна ўзрасьці спажываньне такіх відаў прадуктаў спажываньня, як мяса, малако, салашна, яйкі і інш.

Значнае павялічэньне павінен прадугледзіць плян і ў адносінах норм спажываньня прамысловых тавараў: бавоўняных і вауняных тканін, абутку і г. д., прычым, што асабліва важна падкрэсьліць, нормы спажываньня як харчовых, так і прамысловых тавараў значна растуць як у горадзе, так і на вёсцы.

Для таго, каб забясьпечыць насельніцтва прадметамі спажываньня, прыкладна, у межах тых норм, яб якіх я гаварыў, неабходна стварэньне адпаведнай матар'яльнай базы—разьвіцьцё лёгкай і харчовай прамысловасьці і разьвіцьцё сельскае гаспадаркі, асабліва жывёлагадоўлі. Для другой пяцігодкі праблема жывёлагадоўлі зьяўляецца гэткай-жа рашаючай, якой для першай зьявілася збожжавая.

Побач з гэтым павінны хутка расьці так званыя культурныя галіны прамысловасьці—каляровая, паліграфічная прамысловасьць, вытворчасьць кіно і радыё-апаратуры, фота-апаратуры, разьвіцьцё электрычных прылад, мэдычнага інструмэнтарыю і г. д.

Вялізарнаму разьвіцьцю індустрыяльнага будаўніцтва і зьвязанаму з ім стварэньню новых прамысловых пунктаў спадарожнічае значны рост індустрыяльнага насельніцтва з 35 м. чалавек у 1932 г. прыкладна, да 50 м. чалавек у 1937 г.

Задачы забясьпечаньня культурнага ўдыму, аховы здароўя працоўных, падвышэньня прадукцыйнасьці працы і выхаваньня жанчын-работніц ад нявольніцтва хатняй гаспадаркі патрабуе адпаведнага росту жыльлёвага і камунальнага будаўніцтва.

Мы павінны будзем у межах другога пяцігодзьдзя значна больш поўна здаволіць пралетарскае насельніцтва ў важнейшых індустрыяльных раёнах жылой плошчаю і стварыць цэлую сетку ўстаноў калектыўнага абслугоўваньня бытавых патрэб (апушныя сталоўні, дзіцячыя пакоі і прытулкі, клюбы, сталовыя, пральні і г. д.).

Разгортваньне жыльлёвага і камунальнага будаўніцтва патрабуе стварэньня значнай індустрыі, абслугоўваючай патрэбы камунальнай гаспадаркі як па лініі будаўніцтва, так і па лініі эксплёатацыі: шырокае разьвіцьцё вырабу камунальнага абсталяваньня, электрапрыладаў, прадметаў бытавога абыходу і г. д.

Другое пяцігодзьдзе павінна зьявіц ца пяцігодзьдзем сапраўднага ператварэньня асноўных індустрыяльных пунктаў краіны ў культурныя, тэхнічна і гаспадарча разьвітыя, упарадкаваныя пралетарскія цэнтры і стварэньня большай колькасьці новых сацыялістычных гарадоў.

Правядзеньне шырокіх аздароўчых мерапрыемстваў, разьвіцьцё сеткі ясьляў, кансультацый, распаўсюджваньне санітарнай пісьменнасьці, палепшаньня хатняга ўхаваньня павінны прывесьці да значнага падзеньня захворваемасьці і далейшага скарачэньня сьмяротнасьці, асабліва дзіцячай. Разьвіцьцё грамадзкага жыцьця працоўных, самаадукацыі, фізкультуры, прыцягненьне мас да мастацтва патрабуюць пашырэньня сеткі клюбаў, палацаў працы, залі для відовішчаў і дакладаў, стадыёнаў, спартыўных пляцовак, разьвіцьця вырабу спартыўнага абсталяваньня, фотапапатуры, музычных спрымантаў і г. д.

Задача ператварэньня СССР у краіну перадавой індустрыі непарыўна зьвязана з задачай падвышэньня культурнага ўзроўню работнікаў прамысловасьці і сельскае гаспадаркі.

Ужо недастаткова пагалоўная пісьменнасьць наогул, у асноўным завяваная ў першай пяцігодцы, неабходна пісьменнасьць палітэхнічная, распаўсюджваньне элемэнтарных ведаў па фізыцы, хіміі, біялёгіі, па тэхналёгіі і набыцьцё спэцыяльных тэхнічных навык нараўне з палітэхнічнай пісьменнасьцю.

Палітэхнізацыя школы павінна зрабіцца вагаром перамогі проціпегласьці паміж разумовай і фізычнай працай.

Спажываньне непарыўна зьвязана з вытворчасьцю, і калі ўзровень вытворчасьці, стварэньня эканамічныя прадпасылкі, вызначае сабой той ці іншы ўзровень спажываньня, дык у сваю чаргу ступень задаваленьня спажывецкіх патрэб працоўных ня можа ня ўплываць на прадукцыйнасьць працы і на якасьць работы, а значыцца і на тэмпы і разгортваньне сацыялістычнай вытворчасьці.

Другая пяцігодка ў гэтых адносінах малюе перад намі выключна спрыяючыя задачы.

Умовы выкананьня другой пяцігодкі

Вялізарнасьць задач, якія павінны быць вырашаны намі ў другой пяцігодцы, досыць мною ўжо ахарактарызаваны.

Пыта

Барацьба за ўраджай—

важнейшае зьвяно ў справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў

Усесаюзнай камсамольскай нарадзе па аўладаньні агратэхнікай

(Ліст Кантрольнага Камісара Земляробства Саюзу ССР тав. ЯКАУЛЕВА)

Дарагія таварышы! У мінулым годзе саўгасы і калгасы справядліва гаварылися тым, што на працягу аднаго году яны далі такое памырэньне пасоўных плошчаў, на якое патрабавалася ў царскай Расіі дзесяцігодзьдзе. Гэтыя саўгасы і калгасы даказалі, што яны лепш кулакоў і памешчыкаў умеюць авоёваць новыя прасторы пад земляробства ў нашай краіне. Зараз, адмак, гэтага ўжо мала. Зараз, у 1932 г. трэба казаць і даказаць, што саўгасы і калгасы з нашы раемых плошчаў могуць здымаць лепшы ўраджай. Барацьба за ўраджай—гэта галоўнейшая задача. Барацьба за ўраджай—важнейшае зьвяно ў справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Барацьба за ўраджай—значыць:

1) Пакончыць з агідным, часта дрэнным бескаспадарчым скарыстаньнем зямлі. Прыступіць безадкладна да ўвядзеньня армаведных севазваротаў.

2) Спаратіць тэрміны сяўбы. Кожны лішні дзень спазьненьня сяўбы зьмяншае ўраджай і забірае ў калгаснікаў і ў дзяржавы шмат пудоў збожжа з гектара. Кожны лішні дзень затрымкі сяўбы правых ставіць у засушлівых раёнах яравыя пад удар за сухі.

3) Пакончыць з неахайнасьцю, сьпешкай, дрэннай якасьцю апрацоўкі зямлі. Ворыва з агрохімі, нярэгулярная сяўба з прапускамі—ганьба для саўгасаў і калгасаў.

4) Пакончыць з агідным ламаньнем машын на нашых палёх. Справа ня ў тым, каб 30 гадзін адразу гераічна працерпаваць на машыне, а потым машыну кінуць на злом. Справа ў тым, каб кожная машына працавала цэлай і ў поўным парадку вызначаны ёй лік гадзін увесь сельска-гаспадарчы сезон. Справа ня ў тым, каб узяць з трактара ў апін сезон рэкордны лік работы і потым яго кінуць зала нерэмонтаваным, а справа ў тым, каб працаваць на трактары бяз усякіх перабояў і ўвесь абыйсьціся без капітальнага рэмонту.

5) Найбольш магутная крылада ў барацьбе за ўраджай—МТС. Цэнтральнай фігурай МТС зьяўляецца трактарыст. Створым сталыя кадры трактарыстаў, навучым гэтыя кадры, ператворым іх у майстраў зямлі.

6) У мінулым годзе на мільёнах гектараў пустазельле заглушыла культурныя расьліны. Пустазельле ўжо ў кожным разе не ад «бога», не ад клімату, а ад нашых уласных агідных адносін да справы. Зьнішчым пустазельле старанным апрацоўкай паміж радзьдзяў, апрацоўкай папараў, вылучэньнем засьмечаных зямель пад чыстыя папары.

7) Абязьлічка—самы злосны вораг саўгасаў і калгасаў. Выканаем рашэньне ЦК УсеКП(б) аб брыгадах і брыгадзірах у калгасах—тым самым гаспадарча разгорнем і ўмацуем калгасы, выканаем шэсьць умоў тав. Сталіна! Памятуйце, што брыгада павінна стаць важнейшым зьвяном у арганізацыі працы сельска-гаспадарчай арцелі, якая зьяўляецца на данай стадыі пануючай формай калгасу.

Камсамольцы, вашы магчымасьці ў галіне пристасаваньня новай тэхнікі—вялізарныя. Іменна вы, на працягу аднаго году ў адказ на апрапанову Наркамзема СССР сіламі камсамольцаў выкапаць і запоўніць сілосам мільён ям—сваёй работай дапамагалі саўгасам і калгасам залажыць ¾ мільярда пудоў сілосу. Зараз вы павінны стаць у рады лепшых калгаснікаў і саўгасных рабочых у барацьбе за аўладаньне тэхнікай сельскай гаспадаркі, за прыстасаваньне на нашых саўгасных і калгасных палёх лепшых заваёў аграноміі. Лёзунг аўладаць тэхнікай для вас азначае ня толькі аўладаць тэхнікай у сельскай гаспадарцы, але і аўладаць аграноміяй. Ад кніжкі і дасьледчай станцыі—да брыгады прасуньце правіла навуковага вядзеньня гаспадаркі. За высокі ўраджай! За сапраўдную пасеўную работу камсамольцаў у справе барацьбы за ўраджайнасьць.

Месячнік генэральнай праверкі і агратэхнаход

У выкананьне пастановы ЦК КП(б)Б і ЦВК УсеКП(б) Народны Камісарыят Земляробства БССР праводзіць месячнік генэральнай масавай праверкі падрыхтоўкі да весьнавой пасеўкампаніі і агратэхнаход.

Для кіраўніцтва праверкай і агратэхнаходам пры Наркамземе створан цэнтральны штаб. У раёнах кіруе раённы штаб у складзе прадстаўнікоў РК КП(б)Б, РК КСМ, райза, райкалгасаюзу, райпрафсавету і раённай газэты.

Па правядзеньне месячніку, акрамя студэнтаў ВНУ і навуковых работнікаў, мобілізавана 80 чалавек ад НКЗБ і Калгаскантэру.

Задачы месячніку—праверыць як праходзіць падрыхтоўка да весьнавой кампаніі, як падрыхтаваліся раёны, саўгасы, калгасы, дапамагчы ў хутчэйшай падрыхтоўцы, мабілізаваць шырокія масы калгаснікаў, рабочых саўгасаў і МТС на падрыхтоўку да сяўбы, каб поўнасьцю забясьпечыць ажыцьцяўленьне сельскагаспадарчага пляну. Тут павінна быць улічана: падвышэньне ўраджайнасьці і прадукцыйнасьці жывёлы, павялічэньне таварнай прадукцыі, падвышэньне якасных показьнікаў у сельскай гаспадарцы, практычнага ажыцьцяўленьня 6-ці умоў тав. Сталіна, дапамога ў складаньні вытворча-фінансавых пляноў, капітаковае складаньне і падрыхтоўка касовых фондаў, арганізацыя рамонту трактароў і інвэнтара, прасоўваньне мінэральных угнаеньняў (торф, попел, кампост), работа ў галіне жывёлагадоўлі (укамплектаваньне фэрм, вучная сетка, захоўваньне маладняка), выкананьне задачы ўсіх відаў прадукцыі, арганізацыя садова-гародняй працы (разьбіўка плошчы, падрыхтоўка парнікоў).

Уся работа павінна зьвязацца з арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў.

Акрамя таго, задачай агратэхнаходу зьяўляецца практычнае ўкараненьне агратэхнікі ў масы, арганізацыя спэцыялізаваных гурткоў па аўладаньні агратэхнікай, пры кожным калгасе, сельскім савеце, павінны быць праведзены тэхнічныя нарады, арганізаваны выстаўкі і г. д.

Месячнік праверкі павінен праходзіць пад лёзунгам шырокага правядзеньня ўдарництва і сацыяборніцтва паміж саўгасамі, калгасамі, паасобнымі раёнамі, абмене сацыялістычным вопытам лепшых дасягненняў саўгасаў і перадавых калгасаў. Месячнік праверкі і агратэхнаходу павінен стаць пачаткам сыстэматычнай разгорнутай бальшавіцкай барацьбы за ўкараненьне тэхнікі ў сельскую гаспадарку. Цэнтральныя і раённыя газэты павінны прыняць шырокі ўдзел у правядзеньні месячніка сыстэматычным асьвятленьнем яго.

Н. Байко.

„Очковтирательство" Горацкага аддзелу нарасьветы прывяло да прарыву на фронце лікбезу ў раёне

У пастанове XVI партзьезду сказана: «XV зьезд партыі зусім правільна высунуў адну з праблем рэканструкцыйнага пэрыяду — праблему культурнай рэвалюцыі. Аднак, тэмпы разгортваньня культурнага будаўніцтва ў краіне зусім не дастатковы. Зьезд звароча вае ўвагу на неабходнасьць іх узмацненьня. Правядзеньне ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці павінны стаць баявой задачай партыі на блізкэйшы пэрыяд».

Партыяй і ўрадам БССР пастаўлена задача пераўтварыць БССР у краіну суцэльнай пісьменнасьці да 1-га мая 1932 году.

Гарады — Гомель, Менск, Віцебск, дзе былі ўзяты сапраўды бальшавіцкія тэмпы барацьбы за суцэльную пісьменнасьць, дзе былі ўзьняты на гэтую справу шырокія колы пралетарска - савецкай грамадзкасьці — пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый дабіліся вялізарнейшых посьпехаў. Гомель атрымаў сьцяг ПСПСБ за лікбез. Рад другіх раёнаў у справе ліквідацыі няпісьменнасьці прыходзяць амаль да поўнага ахопу няпісьменных ліквпунктамі. Гэты зрух ёсьць просты вынік разгортваньня масавага паходу рабочых, калгасьнікаў за пісьменнасьць, узмацнілася ўвага да лікбезу з боку партыйных, савецкіх, прафсаюзных і іншых грамадзкіх арганізацый. Уэрасла армія культармейцаў па ўсёй БССР да 15 тысяч чалавек.

Было-б грубейшай памылкай за гэтымі посьпехамі, якія мы маем, ня бачыць тых вялізарнейшых недахопаў і прарываў, якіх ёсьць, на фронце лікбідацыі няпісьменнасьці.

Па вестках раённых арганізацый на 25 студзеня ахоплена 80 проц. няпісьменных ліквпунктамі і школамі малапісьменных ахоплена 50 проц.; гэты процант яўна недастатковы, асабліва, калі ўлічыць той тэрмін, які застаўся да 1-га мая. Па радзе раёнаў гэты процант падае значна ніжэй сярэдняга.

Так, на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце налічваецца 212 няпісьменных і 898 малапісьменных, а ву чобай ахоплены 25—30 проц., такое становішча і на швэйнай фабрыцы. Па г. Клімавічы выяўлена 520 няпісьменных, але няма ніводнага ліквпункта, застаўніцтва на ліквідацыю няпісьменнасьці не мабілізавана, па раёне ўся справа па лікбезе праходзіць самацёкам. У Горацкім раёне адсутнічаюць ліквпункты на МТС, лёно-заводзе, цагельні, у Дрыбенскім саўгасе з 35 няпісьменных рабочых ахоплена ліквпунктамі толькі 4.

Дрэнна абстаіць справа з лікбезам у Крычаўскім раёне. Увесь ахоп няпісьменных складае зараз 798 чал., а малапісьменных 510. Ніякага вучоту ня пісьменных па раёне няма.

Трэба сказаць, што сталай лічбы ня пісьменных па БССР, якая-б характарызавала дакладна колькасьць няпісьменных, няма таму, што ў паасобных раёнах няма сталага вучоту, а адсюль і процант ахопу ліквпунктамі няпісьменных у гэтых раёнах не зьяўляецца правільным, што выявілася па Горацкім раёне, на якім патрэбна спынцца больш падрабязна.

21-га лістапада Сакратарыят ЦК КП(б)Б абавязаў раённыя арганізацыі «праверыць стан работы па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці і забясьпечыць на працягу 2-х дэкадзінкаў ліквідацыю прарыву ў гэтай справе і ўзмацніць штодзённае кіраўніцтва работай».

Як горацкія арганізацыі ўзяліся за ажыцьцяўленьне гэтай дырэктывы, ведаючы, што вучоту ліку няпісьменных па раёне няма?

Падыход да гэтай справы з боку раённага аддзелу нарасьветы быў вельмі просты. Меркавалася па пляне ахапіць няпісьменных 3839 чал., а малапісьменных 1,704 чал. (вучоту ня было, а па лічбах Дзяржпляну няпісьменных налічвалася 4.520 і малапісьменных 5.200) і атрымаўшы весткі з сельсаветаў аб ахопе ліквпунктамі няпісьменных і школамі малапісьменных атрымалася, што няпісьменныя ахоплены ліквпунктамі па раёне на 102.5 проц., а малапісьменных на 178 проц.

Процанты выкананьня плянаў павінны былі вызваць прыняцьце пэўных захадаў з боку аддзелу народнай асьветы, каб выявіць вялічыню нерэальнасьці плянавых меркаваньняў. Аднак, ніякіх захадаў у гэтым напрамку зроблена ня было, а весткі ходу ліквбезу ў процантах накіроўваліся ў адпаведныя арганізацыі.

28-га сьнежня ў газ. «Савецкая Беларусь» у зводцы НКА можна было прачытаць, што ўперадзе па ліквідацыі няпісьменнасьці ідуць Віцебск, Гомель, Плешчаніцы, Горкі. Ці заслужана Горкі папалі разам з Гомелям, атрымаўшыя сьцяг ЦСПСБ, Віцебскам, заняўшым другое месца па лікбезу, у пера давыя раёны? Як абстаіць справа з ліквідацыяй няпісьменнасьці ў Горацкім раёне? Наколькі сапраўднасьць адпавядае тым зьвесткам, якія давалі ся Горацкім аддзелам народнай асьветы?

Выявіць сапраўднасьць становішча ліквідацыі няпісьменнасьці ў Горацкім раёне прыпалося прадстаўніку ЦСПСБ, якога РАНА завяраў, што справа з лікбезам па Горацкім раёне абстаіць добра.

Пасьля праверкі асобных арганізацый у горадзе выявілася, што МТС на лічвае 18 няпісьменных, якія не навучаюцца, цагельня — 30 чал., якія таксама не навучаюцца, на лёнзаводзе лікпункта няма, няма і вучоту няпісьменных, у Інстытутах і па саюзе мэдсанпрацы налічваецца 59 няпісьменных, а ў ліквпунктах навучаецца 28 чал. Гэта з выяўленых па горадзе. Ня лепш справа і па раёне, хоць асобныя прадстаўнікі Горак і заяўлялі: «Прарыў у нас ёсьць некаторы, толькі па горадзе, па раёне-ж справа з лікбезам абстаіць добра».

Гора-рапарт Горацкіх нарасьветнікаў.

На справе-ж у Дрыбенскім саўгасе з 35 няпісьменных рабочых ахоплена ліквпунктамі толькі 4 чалавекі, па сельсавеце не ахоплена ніячэ 70 чалавек.

На раённай канфэрэнцыі настаўнікаў малюнак з лікбезам стаў вельмі ясны. Па радзе сельскіх саветаў зусім ніякага вучоту няпісьменных няма; ёсьць вучасткі, на якіх няма лік пунктаў. **Па прыблізных падліках увесь ахоп няпісьменных ліквпунктамі па раёне складае 30—40 проц.**

Наколькі аддзел народнай асьветы, саюзныя арганізацыі працаўнікоў асьветы добра адносіліся да лікбезу, відаць хаця-б з удзелу іх у гарадзкім зьлёце культармейцаў. Ня гледзячы на дагаворанасьць райпрафсавету з інспэктурай, РК саюзу працасьветы і РК КСМ,—на гэты зьлёт не зьявіўся ні водзін настаўнік, ніводзін камсамолец. Кіраўнікі настаўніцкай канфэрэнцыі (загадчык РАНА і старшыня РК саюзу) лічылі лепшым павесьці ўдзельнікаў канфэрэнцыі ў гэты вечар на опэру.

На пасяджэньні прэзыдыуму райпрафсавету быў пастаўлен даклад РАНА аб ходзе лікбезу. Прышлося канстатаваць вялізарны прарыў у раёне і намеціць рад мерапрыемств для хутчэйшай ліквідацыі гэтага прарыву. Адначасова райпрафсавет вынес пастанову «давесьці да ведама НКА і рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь», што лічбы дадзеныя аб становішчы лікбезу па Горацкім раёне не адпавядаюць сапраўднасьці». Але Райпрафсавет ня даў разгорнутай палітычнай ацэнкі ўсёй гэтай справе, а ўказаў толькі аб палітычнай недаацэнцы лікбезу з боку РАНА і некаторых праф арганізацый.

Ці нельга сказаць аб гэтым больш? Ці не мяжуецца гэта з ігнараваньнем з боку паасобных працаўнікоў дырэктыў партыі і ўраду аб тым, што «лікбіцыя няпісьменнасьці павінна стаць баявой задачай партыі ў бліжэйшы пэрыяд?» Поўная бязьдзейнасьць РАНА ў справе лікбезу, «очковтирательство» у адносінах да партыйных і савецкіх арганізацый ёсьць найгоршы від правага апартунізму.

Нельга абыйсьці ў гэтай справе рай прафсавет і асабліва саюз працаўнікоў асьветы, якія замест барацьбы за дырэктывы партыі ў справе лікбезу, разгортваньне масавага паходу за лікбез — бязьдзейнічалі. Як можна ацаніць паводзіны саюзу мэдсанпрацы, які замест таго, каб ліквідаваць няпісьменнасьць сярод сваіх сяброў саюзу сваімі сіламі, — патрабуе для гэтай працы настаўніка. Відаць, ленінскі лёзунг «пісьменны, навучы няпісьменнага» для саюзу мэдсанпрацы Горацкага раёну невядомы. Як можна расцэньваць адносіны кіраўнікоў студэнцкіх арганізацый Горацкіх Інстытутаў, якія заяўляюць, што справа лікбезу іх не датычыцца, няхай займаюцца імі органы нарасьветы.

Нарэшце, патрэбна сказаць некалькі слоў аб працаўніках РК КП(б)Б т.т. Лапінскім і Белавусаве. Прысутнічаючы на пасяджаньні райпрафсавету, Лапінскі і Белавусаў замест таго, каб завастрыць увагу на прарывах па лікбезе, у сваіх выступленьнях стараліся іх замазаць, заяўляючы, прыблізна так: «Прызнаць ігнараваньне дырэктыў партыі з боку інспэктара — гэта зьвязана з оргвывадамі ў адносінах да інспэктара, а таксама раўналеглых арганізацый».

Па сутнасьці такое разважаньне, такія адносіны садзейнічалі таму «очковтирательству», якое было з боку працаўнікоў РАНА, садзейнічалі тым ураз рэвалюцыйным рапартам, якія пасылаліся аддзелам нарасьветы.

РК КП(б)Б не ўдзяліў дастатковай увагі і кіраўніцтва справе ліквідацыі няпісьменнасьці ў выніку чаго ствараўся такі прарыў.

Раённаму камітэту партыі неабходна са ўсёй рашучасьцю ўдарыць па «очковтирательству», па зрыўшчыках ліквідацыі няпісьменнасьці, ударыць па асобах, якія недаацэньваюць палітычнага значэньня ліквідацыі няпісьменнасьці, мабілізаваць масы, каб бальшавіцкімі тэмпамі ліквідаваць мачоты прарыў, каб сапраўды стаць у перадавыя раёны ў гэтай справе.

Прыклад Горацкага раёну павінен прымусіць органы нарасьветы і некаторых іншых раёнаў рашуча ўзяцца за справу ліквідацыі няпісьменнасьці. **Трэба безадкладна правесьць ва ўсіх раёнах вучот усіх няпісьменных і прыняць захады да поўнага ахопу іх лікпунктамі, трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па «очковтирательству», як найгоршаму віду правага апартунізму.**

Яшчэ больш сур'ёзныя недахопы мы маем у якасьці работы саміх ліквпунктаў. Да гэтых пор на многіх лікпунктах вучоба зусім не ўвязваецца з асноўнымі гаспадарча - палітычнымі кампаніямі — барацьбой за прамфінплян, за аўладаньне тэхнікай, з падрыхтоўкай да севу, барацьбой з кулацтвам і г. д. На многіх ліквпунктах дагэтуль ня ўведзена палітгадзіна. У весковых ліквпунктах няма зачастую і наглядна ня агратэхнічную прапаганду.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што за дача ўзьнялася вытворча - тэхнічнай і палітычнай адукацыі не стала ў цэнтр увагі райаддзелаў нарасьветы.

Усю гэту масу недахопаў і прарываў у практыцы правядзеньня работы па ліквідацыі няпісьменнасьці патрэбна ліквідаваць у найкарацейшы тэрмін. Астаўшыяся 3 месяцы патрэбна зрабіць месяцамі асабліва інтэнсыўнай работы, выключна высокіх тэмпаў.

Безадкладна правесьці поўны вучот няпісьменных і ахапіць іх ліквпунктамі, разгарнуць масавы паход рабочых і калгасных мас, усёй пралетарска - савецкай грамадзкасьці за пагалоўную пісьменнасьць. Трэба узьняць якасьць навучаньня ў ліквпунктах так, як гэтага патрабуе партыя, разгарнуць работу па вярбоўцы культармейцаў, дапамагаць ім мэтадычна і кіраваць іх працай.

Трэба рашуча ўдарыць па правых і «левых» апартуністах, якія сапраўдляюцца пасьпяховаму правядзеньню ліквбезу, імкнуцца сарваць гэту справу, рашуча ўдарыць па «очковтирательству».

Толькі пры ўмове мабілізацыі шырокіх працоўных мас на справу ліквідацыі няпісьменнасьці пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, у рашучай барацьбе з правым і левым апартунізмам, пастаўленая партыяй задача будзе выканана. Справа барацьбы за пагалоўную пісьменнасьць будзе даведзена да канца.

БССР да 1 мая 1932 г. павінна і будзе суцэльна-пісьменнай.

Брыгада ЦСПСБ і «Сав. Бел».
Зарамбоўскі, Сьвярдлоў.

Аб ходзе загатовак насеньня

Пастанова Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

Выслухаўшы даклад Упаўнаважанага Беларускай Канторы Саюзнасеннаводаб'яднаньня тав. Мартэнсона, аб выкананьні пастановы СНК БССР за 26 лістапада 1931 г. «Пра ход загатовак насеньня кармавых траў, кораньплодаў ,гародных культур і і буртаваньня насеньнікаў» (З. З. БССР 1931 году. Аддзел II. № 41, паст. 390), Камісія Выкананьня пры СНК БССР устанаўляе, што памянёная пастанова Беларускай Канторы Саюзнасеннаводаб'яднаньня, саўгастрэстамі і загатоўчымі арганізацыямі ня выканана, у сувязі з чым належнага эруху і пералому па загатоўцы і здачы насеньня не дасягнута.

Дзяржаўным сэктарам (Насеннтрэстам, Малочна - прамысловым трэстам, Садова - гародным трэстам, Птушкатрусагадоўчым трэстам і Сьвіноводтрэстам плян загатовак насеньня па становішчы на 20-I—1932 г. выкананы па кармавых травах — на 7,8 проц., кораньплодах — на 23,3 проц. і гародных культурах на 9 проц.

Загатоўчыя арганізацыі (Белкалгаснасенсаюз, Белхлебжывёлсаюз, Белцёнаканапляводсаюз, Белсадгаросаюз плян выканалі па кармавых травах на 12,7 проц., па кораньплодах на 12,3 проц., па гародных культурах на 4,7 проц. і па гародных бабовых на 17 проц.

Асабліва ганебна адстаюць па загатоўцы насеньня Белхлебжывёлсаюз і Беллёнаканапляводсаюз.

Зусім не пачалі загатовак насеньня наступныя раёны: Бешанковіцкі, Асіпавіцкі, Старадароскі, Вушацкі, Тураўскі, Брагінскі, Клічаўскі, Менскі, Асьвейскі і Каралінскі.

Народны Камісарыят Снабжэньня і Белкаапсаюз са спазьненьнем далі паасвай лініі паказаньні аб вылучэньні прамтаварных фондаў для прэміяваньня здатчыкаў насеньня і да гэтага часу паказаныя фонды фактычна ня вылучаны.

Народны Камісарыят Снабжэньня, Народны Камісарыят Земляробства, Беларуская Кантора Саюзнасеннаводаб'яднаньня і Белкалгасцэнтр ня ўжылі дастатковых захадаў узьдзейнічаньня на загатоўчыя арганізацыі і здатчыкаў насеньня і не ўстанавілі належнага кантролю за здачай насеньня саўгасаў, раённых зямельных аддзелаў і асабліва раённых інспэктароў снабжэньня і раённых калгасаюзаў, якія амаль нікага ўдзелу ў правядзеньні загатовак насеньня ня бралі.

З прычыны неўважлівых адносін дырэктароў саўгасаў: Прылукі, Тарасава, Русановічы, Калініна, Цімкавічы, Боркі - Белевічы, Некрашы, Самуэлева і Равайчы, і загадчыкаў Слуцкага, Бабруйскага, Нова-Барысаўскага і Аршанскага пункту Саюзхлеба пералічанымі саўгасамі здана і прынята на склады Саюзхлеба нядобраякасная сартовае насеньне з павялічанай вільготнасьцю і засьмечанасьцю.

Саюзхлебам своячасова не пачата давядзеньне насеньня да кандыцыйнай якасьці, што стварае пагрозу далейшага захаваньня насеньня, а таксама не наладжан вучот паступленьня сартавога насеньня на склады і своячасовую падачу вестак.

Выходзячы з гэтага, Камісія Выкананьня пры СНК БССР—**пастанаўляе:**

1. Паказаць Упаўнаважанаму Беларускай Канторы Саюзнасеннаводаб'яднаньня тав. Мартэнсону, на тое, што ім ня ўжыты патрэбныя захады для выкананьня плянаў загатоўкі і здачы насеньня па саўгасным сыстэме, а так сама і па лініі загатоўчых арганізацый.

2. Папярэдзіць старшынь: Белкалгаснасенсаюзу тав. Жарына, Белхлебжывёлсаюзу тав. Журомскую, Беллёнаканапляводсаюзу т. Брэля, Белгадгародсаюзу т. Панамарова і дырэктароў Насеннтрэсту тав. Каралёва і Белсадгародтрэсту тав. Самохіна, аб іх персанальнай адказнасьці за выкананьне пляну здачы насеньня ва ўстаноўленыя граничныя тэрміны

3. Паказаць старшыням Бешанковіцкага, Асіпавіцкага, Старадароскага, Камарынскага, Вушацкага, Тураўскага і Клічаўскага раённых выканаўчых камітэтаў на недапушчальнасьць пасьпяховых адносін да справы загатовак насеньня і папярэдзіць, што на іх асабіста ўскладаецца адказнасьць за выкананьне пляну па загатоўцы насеньня і забясьпечаньне раёнаў насеньнем.

4. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Снабжэньня (т. Красоўскаму) і Белкалгасцэнтру (т. Міцькову). зараз-жа ўжыць захады да забясьпечаньня актыўнага ўдзелу раённых інспэктароў снабжэньня і раённых калгассаюзаў у выкананьні пляну загатовак насеньня, устанавіўшы дачу раённымі інспэктарамі снабжэньня і раённымі калгассаюзамі справаздачнасьці кожную пяцідзёнку.

5. Абавязаць Раённыя Выканаўчыя Камітэты пад асабістую адказнасьць старшынь, безадкладна арганізаваць суцэльную праверку выкананьня калгасамі і аднаасобнікамі кантракцыйных дагавароў на здачу насеньня кармавых траў, кораньплодаў і гародніх культур.

6. Абавязаць Народны Камісарыят Земляробства (тав. Паніматка), Народны Камісарыят Снабжэньня (т. Красоўскага) і Белкалгасцэнтр (т. Міцькова), для ўзмацненьня загатовак насеньня мабілізаваць не пазьней 6 лютага г. г. ня менш 50 работнікаў свайго апарату, саўгастрэстаў і загатоўных арганізацый і паслаць іх у раёны на тэрмін да поўнага выкананьня пляну загатовак.

7. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Снабжэньня, пад асабістую адказнасьць тав. Розіна, у пяцідзённы тэрмін вылучыць прамтаварныя фонды для прэм'яваньня здатчыкаў насеньня, а Белкаапсаюзу, пад асабістую адказнасьць тав. Рубэна, зараз-жа давесьці гэтыя фонды да раённых саюзаў спажывецкай кааперацыі для выдачы здатчыкам насеньня.

8. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства, Белкалгаснасенсаюзу і Белкалгасцэнтру на працягу дэкады ўкамплектаваць раённыя насенканторы агранамамі і спэцыялістамі па загатоўцы насеньня.

9 Абавязаць Беларускую Кантору Саюзхлеба, пад адказнасьць тав. Наўмоўскага, у пяцідзённы тэрмін устанавіць колькасны і якасны вучот дзяржўнага сартавога фонду ў кожным пункце Саюзхлеба і ў дэкадны тэрмін скончыць апрацоўку насеньня да кандыцыйнай якасьці, а таксама прыцягнуць да адказнасьці загалчыкаў Слуцкага, Аршанскага, Бабруйскага і Нова-Барысаўскага пунктаў за недобраякасны прыём і дрэннае захаваньне сартавога насеньня.

10. Даручыць пракурору Рэспублікі прыцягнуць да адказнасьці за зрыў пляну загатовак насеньня старшыню Менскай садканторы т. Махнача і старшынь раённых калгасаюзаў Асьвейскага тав. Ешчыка і Клімавіцкага тав. Люцікава і за здачу нядобраякаснага сартавога насеньня дырэктароў саўгасаў Прылукі і Цімкавічы.

11. Даручыць Беларускай Канторы Саюзнасеннаводаб'яднаньня праз 2 дэкады паведаміць Камісіі Выкананьня аб ужытых захадах для выкананьня пляну загатовак і здачы насеньня па саўгасным сыстэме, а так сама і па лініі загатоўчых арганізацый.

Старшыня Камісіі Выкананьня пры СНК БССР М. Галадзед.

Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР Я. Эльків.

31—I. 1932 г.
г. Менск.

Закрыўся зьлёт ударнікаў сьвінагадоўчых саўгасаў

10 лютага закончыў сваю работу зьлёт ударнікаў сьвінагадоўчых саўгасаў.

Зьлёт заключыў сацдагавор паміж сьвінасаўгасамі БССР і Заходняй вобласьці па цэлым радзе паказьнікаў у справе палепшаньня сьвінагадоўлі, як то: стварэньня кармовай базы, арганізацыі працы, 100-процантае захаваньне маладняка, здача саўгасамі БССР 180.000 таварных галоў (кожная галава павінна важыць ня менш 90 кгр.).

Зьлёт ухваліў адозву камсамольцаў-ударнікаў сьвінасаўгасу Райцы, якія высунулі сустрэчны плян па сьвінага доўлі і выклікалі на сацыяборніцтва на лепшае гадаваньне сьвіней усіх камсамольцаў сьвінасаўгасаў Заходняй вобласьці.

Зьлёт паслаў прывітальную тэлеграму ЦК КП(б)Б.

Нам. адказнага рэдактара Г. АДАМС ОН.

Гукавы кіно тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Каса з 1 г. дня — НОВЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ТОММІ

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 гадз. — ЦІХІ ДОН У галоўнай ролі Цэсарская

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" — БЯРОЗАДАСНАЯ ВУЛІЦА Трэцяе і 8 частак

БЕЛКАМУНБАНК

даводзіць да ведама ўсіх ведамстваў і арганізацый, якія мяркуюць будавацца ў 1932 г., што крэдытаваньне іх на падрыхтоўку будматар'ялаў і падрыхтоўку будаўніцтва (копка катлаванаў, закладка фундаментаў)

БУДЗЕ АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЦЦА БАНКАМ, ШЛЯХАМ ВЫДАЧЫ МЭТАВЫХ ПАЗЫК,

тэрмінам пагашэньня 1 красавіка г. г.

Для атрыманьня пазыкі неабходна неадкладна-ж пэдставіць:

1. Рэзьмер патрабуемай пазыкі.
2. Мэтавае прызначэньне, на падрыхтоўку будматар'ялаў, альбо падрыхтоўку будаўніцтва, калі на абедзьве мэты разам, дык паказаць адну ў кожнай паасобку.
3. Плян будаўнічых работ на 1932 год.
4. Даведка Дзяржпляну аб уключэньні ў плян фінансаваньня будаўніцтва 1932 г.
5. Копія дагавораў з падрадчыкамі і дастаўшчыкамі.
6. Абавязацельства (форма абавязацельства для падпісаньня будзе неадкладна выслана па атрыманьні ад вас матар'ялаў, паказаных у пунктах 1—5).

БЕЛКАМУНБАНК

БЯРЭЗІНСКІ РАЙСПАЖЫЎСАЮЗ

паведамляе ўсе зацікаўленыя ўстановы і асобы якія мелі прэтэнзіі да былога Бярэзінскага Райспажыўтаварыства ў 1931 годзе

павінны прэдявіць свае прэтэнзіі ў двухты нёвы тэрмін з дня апублікаваньня.

Пасьля гэтага ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.

Бярэзінскі Райспажыўсаюз

З 1-га лютага г. г. у гор. Менску

АРГАНІЗАВАНА Беларуская кантора акц. т-ва „Крэдыт-Бюро"

КАНТОРА ЎТВАРАЕ СПАГНАНЬНІ ПА ЎСІХ ПРЭТЭНЗІЯХ аб спадчыне за мяжой, а таксама па полісах страхавых т-ваў „Нью-Ёрк" і „Эмпэрэль".

Беларуская кантора акц. т-ва „Крэдыт-Бюро" знаходзіцца ў будынку Дзяржбанку

Тэрмін падачы полісаў т-ва „Нью-Ёрк" ПРАЦЯГНУТЫ ДА 1-га КРАСАВІКА 1932 году

5-ты вучастак 1-га Саюзсельоудгрэсту, знаходзячыся ў м. Зембін, з 1-га лютага 1932 г. ЛІКВІДУЕЦЦА

Усім юрыдычным і фізычным асобам, якія маюць да вучастку прэтэнзіі грашовага альбо матар'яльнага характару, просьба прадявіць вучастку да 20 лютага 1932 г., пасьля якога тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.

Начальнік вучастку Сівярынкі
Бухгальтар Вайсхоўскі

АБ'ЯВА АБ РЭГІСТРАЦЫІ

15 студзеня 1932 г. Народным Камісарыятам Фінансаў БССР на падставе арт. 2-4 Палажэньня аб дзяржаўнай рэгістрацыі ад 9-II 1931 г. (Збор Законаў і Загадаў СССР № 8, паст. 99)

ЗАРЭГІСТРАВАНА Ў РЭЕСТРЫ ЮРЫДЫЧНЫХ АСОБ за № 103 (сто тры)

Аб'яднаньне арганізацый кнігі БСПК

Беларускае Тарфяное Аб'яднаньне Прамысловай Кааперацыі

„БЕЛКААППРАМТОРФ"

МЕСНАЗНАХОДЖАНЬНЕ АБ'ЯДНАНЬНЯ: Менск, Інтэрнацыянальная, 9

Мазырскому Гарканбінату ПАТРЭБЕН для электрастанцыі мэханік-электрамацёр і электра-інжынер вышэйшай кваліфікацыі, знаёмы з 3 хфазным токам

АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ

ПАКРАДЗЕНЫ Камісарыяцкі білет, выд. Менскай мяс ЛКСМБ, стаўшае пасьведчаньне асобы выд. рэдакцыяй газэты „Савецкая Беларусь" на імя БАЬОМ Я.

лічыць несапраўднымі

ЗГУБЛЕНА круглая пячатка калгасу імя Дзяржынскага Прыгарадняга сельсавету, Менскага раёну,

лічыць несапраўднай

ЗГУБЛЕНЫ конск білет № 11, выд. Пухавіцкім РВК ЛЕЎКАЎЦЭВІЧ,

лічыць несапраўдным

ЗГУБЛЕНЫ:

Вайсковая кніжка Гайдука С., выд. Менскай асабов. р. сувязі. Кв. 1221.

Пасьведчаньне № 92 аб скончэньні 6 груп, Ядрэўскага Я., выд. Балянецкай 7-годкай. Кв. 1227.

Вайсковы білет Анопка А. І., выд. Росанскім РВК. Кв. 1225.

Саюзны білет за № 50 Казінцавага. Кв. 1235-п.

Вайсковая кніжка і бестэрміновы па
Вайсковая кніжка і бестэрміновы па скай міліцыяй. Кв. 1224.

Чырвонаармейскі білет Кавалёва Л. Л., выд. Журавіцкім райваенкаматам, Квіт. 1226.

Паевая кніжка за № 6091 і 6092 Лугоўскага Я., Квіт. 1228-п.

Членскі прафсаюзны білет Зарэцкага Е. М., выд. Карасьценскім вучпрафсаюзам, і вайсковая кніжка, выд. Каралінскім РВК. Кв. 1229-п.

Вайсковая кніжка Жумкова С. Кв. 1230-п.

Вайсковы білет Зеневіча П. М., выд. Грэскім вайсковым аддз. за № 55 і Цітаўскае пасьведчаньне за № 36. Кв. 1231-п.

Паявая кніжка Казінцавага Т. В., выд. Ельскім ЦРК. Квіт. 1233-п.

Вайсковы білет Казінцавага Т. В., Квіт. 1234-п.

Камсамольскі білет за № 11386 Казінцавага Т. В., Квіт. 1236-п.

Вучотная кар